ЭЛАР ПланСкан А2В

Москва. Библиотека ВСНХ СССР Ст. Сьн /32. I/

ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам)
На 1 мес. — 80 к.
„ 3 мес. — 2 р. 30 к.
„ 6 мес. — 5 р. —
„ 12 мес. — 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніе абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьніж тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адвел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА, 17 мая 1930 г.
№ 113 (3711)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

НОВЫ АТРАД ПРАЛЕТАРАЎ-ВЫЛУЧЭНЦАЎ—

МОЦНЫ ЎДАР ПА БЮРАКРАТАХ, ЧЫНОЎНІКАХ, ПА КЛЯСАВЫМ ВОРАГУ

Сёньня курсы рабочых-вылучэнцаў пры ЦК КП(б)Б выпускаюць больш 100 т.т. на адказную работу ў цэнтральны савецкі і гаспадарчы апарат

Бальшавіцкае прывітаньне выпускніком-вылучэнцам

Першаму выпуску курсаў рабочых-вылучэнцаў пры ЦК КП(б)Б

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б вітае першы выпуск курсаў рабочых-вылучэнцаў, якія накіроўваюцца на кіруючую работу ў цэнтральных установах БССР.

ЦК спадзяецца, што рабочыя-вылучэнцы, прайшоўшы школу практычнай работы і атрымаўшы тэарэтычную падрыхтоўку, будуць моцнымі барацьбітамі за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі ў барацьбе з бюракратызмам, з інэртнасьцю дзяржаўнага апарату, будуць рашуча змагацца за карэннае паляпшэньне гэтага апарату, за выразнасьць у яго рабоце, за набліжэньне яго да мас, за разьвіцьцё рабочага кантролю і шэфства фабрык і заводаў над установамі.

Задача далейшага вылучэньня рабочых на кіруючую работу мае надта вялікае значэньне ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы ў краіне, калі ад кожнага работніка дзяржаўнага апарату патрабуецца максымум клясавай чуласьці, шчыльная сувязь з масамі працоўных і ўменьне праводзіць лінію партыі.

Вылучэньне рабочых асабліва важна ў нашых нацыянальных умовах, дзе, пры наяўнасьці складаных абставін нацыянальнага характару, ад рабочых-вылучэнцаў патрабуецца ўменьне правільна праводзіць нацыянальную палітыку камуністычнае партыі, уменьне рашуча змагацца з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, а таксама і з шавінізмамі розных колераў.

ЦК КП(б)Б упэўнен, што рабочыя-вылучэнцы пад кіраўніцтвам партыі будуць у першых шэрагах змагароў за канчатковую перамогу сацыялізму.

ЦК КП(б)Б.

ПЕРШАЯ ПРАКТЫКА

Праблема падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў зьяўляецца адной з асноўных праблем сацыялістычнага будаўніцтва. У БССР, улічваючы спэцыфічныя ўмовы (непялікая пралетарская праслойка, нацыянальная стракатасьць), гэта праблема мае выключнае значэньне. Асабліва трэба падкрэсьліць палітычнае значэньне задачы ўмацаваньня кіраўнічых кадраў.

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, бязьлітасна змагаючыся з права-апартуністычнымі элемэнтамі і «левымі» загібшчыкамі, ударааючы па нацыянал-апартуністых і шавіністых усіх колераў—рашуча вылучае новыя кадры кіраўнікоў з перадавой часткі рабочых мас на ўсе франты сацыялістычнага будаўніцтва. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б узяў цьвёрды курс на ўмацаваньне кіраўнічых кадраў рабочымі ад варштату. На ініцыятыве бюро ЦК, у лістападзе мінулага году былі арганізаваны цэнтральныя 6-цімесячныя курсы для падрыхтоўкі рабочых вылучэнцаў.

На курсы былі залічаны 114 рабочых ад варштату, з якіх кожны меў ня менш 10-гадовага вытворчага і 5-гадовага партыйнага стажу. Кожны вылучэнец меў таксама значны стаж партыйна-грамадзкай работы. Курсы мелі на мэце: узьнімць агульна-асьветны і тэарэтычны ўзровень вылучэнцаў, даць ім мінімальна патрэбную практыку для кіраўнічай работы.

Падагульваючы вынікі работы курсаў, можна сьмела сказаць, што гэта задача ў асноўным выканана. Навучальны плян выкананы з некаторым перавышэньнем. Гэта стала магчымым толькі дзякуючы напружанай рабоце курсантаў-вылучэнцаў і добрасумленным адносінам да сваёй работы з боку асноўнай масы выкладчыкаў. Зразумела, у рабоце курсаў былі і некаторыя недахопы. Мелі месца пэўныя мэтаўчыныя і арганізацыйныя недахопы ў выкананьні навучальнага пляну. Асобныя установы ня ўважліва і проста бюракратычна адносіліся да вылучэнцаў у часе практыкі. Але-ж напружанасьць і ўпартасьць вылучэнцаў у рабоце і вучобе, асабліва выключная ўвага да курсаў з боку ЦК, пераматлі гэтыя недахопы.

З агульнага ліку курсантаў-вылучэнцаў, якія скончылі курсы, 98 чалавек пасылаюцца на кіраўнічую работу у цэнтральны апарат. Частка вылучэнцаў ужо прызначана на такія пасады як намесьнік наркома асьветы, намесьнік старшыні Дзяржпляну, член прэзыдыуму ВСНГ, намесьнік старшыні Белкалгасцэнтру, члены калегій наркаматаў, дырэктары і намесьнікі дырэктароў трэстаў, загадчыкі аддзелаў камісарыятаў і г. д. На акруговую кіраўнічую работу пасылаецца 10 чалавек.

Паводле нацыянальнага складу курсанты падзяляюцца наступным чынам: беларусаў—64, яўрэяў—30, расіянаў—7, палякаў—4 і рэшта—латышы і інш. Сярод курсантаў-вылучэнцаў, скончыўшых курсы, 26 жанчын.

Зразумела, што за кароткі тэрмін курсаў (6 месяцаў) нельга было даць усёй сумы ведаў, патрэбных для кіруючых працаўнікоў цэнтральнага апарату. Асабліва спачатку сваёй работы вылучэнцы будуць гэта некаторы час адчуваць. Задача і абавязак установы і арганізацый, асабліва партыйных ячэек, штодзенна дапамагаць вылучэнцам і стварыць патрэбныя ўмовы работы.

Вылучэнцам трэба памятаць, што для таго, каб ахапіць і ўсьвядоміць увесь складаны працэс сацыялістычнага будаўніцтва, ім, як кіраўніком, патрэбна далейшая самастойная вучоба. Вылучэнцам неабходна памятаць таксама і пра тое, што яны павінны трымаць непарыўную сувязь з калектывамі рабочых сваіх прадпрыемстваў.

Першая практыка падрыхтоўкі рабочых для вылучэньня цалкам сябе апраўдала. Гэту практыку трэба паўтараць і ўзмацніць.

Рабочым-вылучэнцам, якія сёньня кончаюць курсы, пажадаем посьпеху ў іх рабоце.

КАРАСЬ.

Новы струмень пралетарскіх сіл

Сёньня цэнтральныя курсы вылучэнцаў рабочых, арганізаваныя ЦК КП(б)Б выпускаюць пасьля 6-цімесячнай падрыхтоўкі больш 100 чалавек, якія пасылаюцца на кіруючую работу ў савецкі апарат і розныя гаспадарчыя арганізацыі. Гэта ўвальве новы струмень свежых пралетарскіх сіл у дзяржаўны апарат, яні так востра адчуває партэбу ў гэтым.

Рабочая кляса Беларусі вылучыла са свайго асяродзішча лепшых сваіх людзей, прыкладных вытворцаў, найбольш актыўных у партыйным жыцьці таварышоў, большасьць арганізацый падышлі сур'ёзна да пытаньня адбору вылучэнцаў. Рад з іх знаходзіцца ў складзе райкомаў, акругкомаў, ЦК, кантрольных органаў і іншых кіруючых прафсаюзных і савецкіх органаў. Гэта дае падставу быць упэўненым у тым, што вылучэнцы, пасланыя на кіраўнічую работу ў савецкі апарат, будуць надзейнай апорай партыі ў яе барацьбе і рабоце па аздараўленьні і ўзмацненьні дзяржапарату, па яго перабудаваньні і прыстасаваньні да новых задач рэканструкцыйнага пэрыяду, найбольш актыўнымі барацьбітамі за правядзеньне правільнай пралетарскай лініі з боку савецкага апарату.

Не пераацэньваючы праз меру вынікаў работы гэтых курсаў, можна ўсё-ж упэўнена сказаць, што курсы за гэты тэрмін далі здавальняючыя рэзультаты, што яны палітычна некалькі падрыхтавалі вылучэнцаў, што ў злучэньні з добрай пралетарскай школай, якую прайшлі вылучэнцы на вытворчасьці, апошнія ў стане справіцца з тымі задачамі, якія ставіць перад імі партыя і рабочая кляса, накіроўваючы іх на кіраўнічыя пасты ў савецкі і гаспадарчы апарат.

Чыстка савецкага апарату ад клясава-варожых, бюракратычных і няздольных праводзіць правільную клясавую лінію элемэнтаў можа даць найбольшыя вынікі толькі ў тым выпадку, калі побач з чысткай партыя і рабочая кляса будуць улівацьу савецкі апарат новыя сьвежыя пралетарскія сілы, лепшых работніц і рабочых з вытворчасьці. Гэта работа па далейшым арабочаньні савецкага апарату павінна праводзіцца ў асаблівасьці ў нашых умовах фарсаваным тэмпам, бо праблема ўмацаваньня кіруючых пралетарскіх кадраў стаіць з асаблівай вострасьцю ў нац. рэспубліках.

Якія-ж задачы стаяць перад вылучэнцамі, што ідуць у дзяржаўны апарат? У першую чаргу асноўнай і важнейшай задачай вылучэнцаў зьяўляецца правядзеньне самай актыўнай работы па барацьбе з недахопамі, бюракратычнымі скажэньнямі, скрыўленьнямі клясавай лініі, выяўленьне і ачышчэньне савецкага апарату ад усіх бюракратычных, бяздушных, варожых, шкодніцкіх і няздольных праводзіць выразную пралетарскую лінію элемэнтаў, якія яшчэ і пасьля чысткі савецкага апарату засталіся ў ім. З аднаго боку, вылучэнцы павінны яшчэ больш умацаваць сувязь савецкага апарату з рабочай масай і бядняцка-серадняцкім сялянствам, павінны дапамагаць справе максымальнага разгортваньня новых форм і мэтадаў рабочага кантролю над савецкім апаратам (рабочае шэфства, рабочыя брыгады і інш.), рабочыя вылучэнцы, якія ідуць у савецкі апарат, абавязаны быць найбольш актыўнымі спаборнікамі за шырокае і сьмелае разгортваньне самакрытыкі, «ня гледзячы на асобы», абавязаны ісьці на чале пралетарскай самакрытыкі, накіроўваючы ярасьць мас на барацьбу з шматлікімі недахопамі і скажэньнямі дзяржапарату. Ад кіраўнікоў розных устаноў і парт'ячэек ЦК патрабуе самых уважлівых і чулых адносін да вылучэнцаў, таварыскага падтрыманьня і дапамогі ў іх рабоце.

Праблема ўмацаваньня кіраўнічых кадраў мае рашаючае значэньне для ўсяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Таму кожная новая перамога на фронце кадраў умацоўвае і паскорае нашае сацыялістычнае будаўніцтва, кожная новая сотня пралетараў, улітая ў савецкі апарат—найбольш моцны ўдар па бюракратах, чыноўніках, якія скажаюць пралетарскую лінію, удар па клясавым ворагу.

Наш савецкі апарат папаўняецца новай сотняй, а за гэтай—прыдуць іншыя многія сотні і тысячы лепшых, загартаваных у клясавых баёх пралетараў, якія зробяць савецкі апарат яшчэ больш магутным праваднікам волі пралетарыяту.

В. ГАНТМАН.

ЦСПСБ вітае новы атрад рабочых-вылучэнцаў

Хуткі рост сацыялістычнага разьвіцьця народнай гаспадаркі патрабуе больш шпаркіх тэмпаў падрыхтоўкі кіруючых пралетарскіх кадраў. Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) і студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах ясна паказалі на неабходнасьць значнага ўзмацненьня тэмпаў падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў і больш рашучага падыходу з боку партыйных, прафэсыянальных, гаспадарчых і савецкіх органаў да вылучэньня рабочых на кіраўнічую работу і забесьпячэньня пастаяннай дапамогі вылучэнцам у іх штодзённай працы.

Партыя і рабочая кляса патрабуюць ад рабочых-вылучэнцаў рашучай барацьбы з бюракратызмам, цяганінай, гультайствам, нячулымі адносінамі ў нашым савецкім, прафэсыянальным і гаспадарчым апаратах.

Вітаючы курсантаў-вылучэнцаў, ЦСПСБ упэўнены у тым, што вылучэнцы, якія атрымалі тэарэтычную падрыхтоўку, маючы выстарчальную пралетарскую, партыйную загартаванасьць, на сваёй працы выканаюць усе тыя задачы, якія на іх ускладае партыя і рабочая кляса.

ЦСПСБ.

VIII Менская акруговая партканфэрэнцыя

склікаецца

на 18 мая, а 7-й гадз. увечары ў Доме Камасьветы (б. клюб імя Карпа Маркса)

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад ЦК КП(б)Б — т. ГЕЙ
2. Даклад ЦКК КП(б)Б — тав. КАЛНІН.
3. Справаздача АК КП(б)Б — тав. СЛАВІНСКІ.
4. Справаздача рэв. камісіі — тав. МУЛЯЎКА.
5. Справаздача АКК — т. ДАМБРОЎСКІ.
6. Вынікі сацбудаўніцтва ў акрузе на падставе выкананьня пяцігодкі і далейшыя задачы — тав. АКСЮЧЫЦ.
7. Аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі акругі — тав. ТАМАШЭЎСКІ.
8. Выбары кіруючых парторганаў.
9. Выбары дэлегатаў на зьезды КП(б)Б і УсеКП(б).

Норма прадстаўніцтва: 1 дэлегат з пастаноўчым голасам ад 25 членаў партыі і 1 дэлегат з дарадчым голасам ад 50 кандыдатаў у члены партыі.

Мандаты можна атрымаць у памяшканьні АК 17 мая з 10 гадз. раніцы да 4 гадз. і з 6 да 9-ці гадз. увечары і 18-га ад 10 да 4-х гадз. дня.

САКРАТАР Мен. АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

Арабочым савецкі апарат

Калі мы прыехалі на курсы пасьля работы на заводах і фабрыках, нам хацелася, як найлепш, узброіцца ведамі за гэты час, каб лепш было спраўляцца на практычнай працы, каб лепш было ажыцьцёвіць той наказ рабочых, якія вылучалі нас на курсы. Рабочыя, якія пасылалі нас на курсы, заўсёды гаварылі, каб мы, працуючы ў савецкім апараце, трымалі цесную сувязь з тымі прадпрыемствамі, якія нас вылучылі, каб працуючы ў савецкім апараце перанесьці ўсю практыку вытворчасьці ў дзяржапарат. Заўсёды выразна праводзіць клясавую лінію ў савецкім апараце — гэта важнейшая наша задача.

Мы ведаем, што вылучэньне рабочых у савецкі апарат, г. зн. яго арабочаньне — ёсьць важная палітычная задача. Гэта дапамога зрабіць работу савецкага апарату больш гібкай, больш блізкай да запатрабаваньняў шырокіх працоўных мас.

Курсантка Вольпава.

ЗЬБІЕНЬНЕ ФАШЫСЦКІМІ ДРУЖЫНЬНІКАМІ БЕЛАРУСКІХ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ

ВАРШАВА, 16. У Лідзкай акрузе, дзе зараз ідзе прадвыбарчая агітацыя ў сувязі з надыходзячымі выбарамі ў сойм, фашысцкія дружыны і пераапранутыя шпікі напалі на дэпутатаў беларускага рабоча-сялянскага блёку. Дружыньнікі напалі на іх, калі пасьля мітынгу яны вярталіся на станцыю чыгункі. Відавочна, зьбіеньне рэвалюцыйных дэпутатаў шпікамі пад выглядам абуранага натоўпу ўведзена зараз у сыстэму.

Рад калгасаў пасьпяхова скончыў сяўбу

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва вядуць да поўнага і своячасовага выкананьня пасеўных плянаў

Маруднае выпраўленьне перагібаў тармозіць сяўбу на Аршаншчыне

АРШАНСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ТРЭБА ДАБІЦЦА НЕАДКЛАДНАГА ЗРУХУ У ПАЛЯВЫХ РАБОТАХ

САПРАЎДНЫЯ УЗОРЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ

Рад калгасаў Жлобіншчыны з посьпехам разгортваюць сяўбу.

На 9-га мая калгас «Новае Жыцьцё» выканаў пасеўны плян на 55 проц. Сяўба будзе скончана да 20-га мая. Калгасьнікі працуюць з вялізарным энтузіязмам над выкананьнем гэтай задачы. Ужо засеяна аўсу 20 гэкт. (45 проц. пляну), пшаніцы 10 гэкт. бульбы—10 гэкт. (55 проц.), канюшыны 10 гэкт., ільну—8 гэкт., ячменю 9 гэкт., жыта яравога—4 гэкт. і інш. Не хапае 40 пуд. ячменю, 80-100 пуд. грэчкі, а райкалгассаюз і праўленьне кусту ў Стрэшыне не аказваюць патрэбнай дапамогі.

Калгас «Расьсьвет-Пераможца» канчае сяўбу. На 9-га мая пляны былі выкананы на 85-90 проц. Пасеўная плошча ў калгасе павялічваецца на 13-15 проц. «Расьсьвет-Пераміжца»—дапамагае калгасу «Кастрычнік» трактарамі, насеньнем і інш. У гэтым калгасе палова калгасьнікаў-ударнікі.

Сапраўды бальшавіцкі ўзор паказваў калгас «Чырвоная Ніва».». У весь капабясьсіўі сябе ўдарным. Уперадзе батрачкі. На 9-га мая ўвесь яравы клін калгасу быў засеяны на 100 проц.

Пасьпяховая сяўба выклікала прыліў індывідуальнікаў у калгас.

Трэба адзначыць што дапамога з боку праўленьня кусту невыстарчальная. Старшыня праўленьня затрымлівае і ня выдае калгасу 1.000 руб., вызначаныя для куплі інвэнтару. Е. САЛДАЦЕНКА.

Замкнутасьць тармозіць далейшы рост калгасаў

Зводка аб ходзе сяўбы па Полацкім раёне гаворыць, што на 10-га мая калгасы засялі 21,7 проц. свайго яравога кліну, а індывідуальны сэктар выканаў 24,23 свайго пляну. Мясцовыя работнікі тлумачаць адставаньне калгасаў ад індывідуальнікаў тым, што весткі аб ходзе сяўбы калгасы даюць з вялікім спазьненьнем і што іх даныя, такім чынам, не адказваюць сапраўднасьці.

Факты гаворыць, аднак, што ня ў гэтым прычына адставаньня. Як прыклад возьмем камуну «Чырвоная Зорка», якая знаходзіцца ў прыгарадным сельсавеце. Нават у гэтым калгасе, які знаходзіцца над самым горадам, сяўба не арганізавана, як належыць. Камуна нават ня мае рабочага пляну. Тэмп сяўбы ў ёй адстае ад тэмпу вакольных індывідуальных гаспадарак.

Такім чынам, асноўная прычына адставаньня тэмпаў сяўбы ў калгасах трэба лічыць тое, што **мясцовыя арганізацыі не зьвярнулі належнай увагі на правільную арганізацыю палявых работ у сацыялістычным сэктары.**

Вельмі кульгае і якасны бок сяўбы. Аб тым, што раённыя арганізацыі мала цікавяцца гэтай галіной работы, сьведчыць хаця-б той факт, што яны ня маюць весткі аб ходзе такой важнай справы, як пратручэньне насеньня. Асобныя-ж весткі з месц гавораць, што і калгасы, і індывідуальны сэктар слаба пратручваюць насеньне. Тлумачыцца гэта **адсутнасьцю патрэбнага інструктажу.** Пасеўшчыкі бачацца праводзіць пратручэньне, выконваючы толькі з пісьмовых паказаньняў, без непасрэднага кіраўніцтва агра-пэрсаналу. Праўда, чатыры аграномы, якія ёсьць у раёне, ня могуць справіцца, каб абслужыць увесь раён, бо аднаго калгасу 35. Аднак, работа і гэтых аграномаў кульгае з якаснага боку. Справа ў тым, што аграном підзе надоўга не затрымліваецца і ўвесь час тое і робіць, што праяжджае з месца на месца.

Зусім абураючае становішча з ачысткай насеньня. Тут ужо пэўна можна было абыйсьціся без непасрэднага кіраўніцтва агра-пэрсаналу». Між тым, мы стаімо перад фактам ачысткі насеньня ў раёне ўсяго на 80 проц.

Агра-мінімум і плян пашырэньня пасеўнай плошчы не даведзены да асобнага двара. **Старшыні сельсаветаў нават ня ведаюць дзе і за лін якіх зямель трэба пашыраць пасеўную плошчу.**

Усё гэта гаворыць аб тым, што ў азначаных недахопах вінаваты і мясцовыя і раённыя арганізацыі. Трэба канстатаваць, што вясковы актыў і агра-ўпоўнаважаныя, якія маглі-б ажыцьцявіць патрэбныя мерапрыемствы, як належыць, не праінструктаваны і ня прыцягнуты да актыўнага ўдзелу.

Застаецца дадаць, што райсэмчастка яшчэ не забясьпечыла апрацоўку былых кулацкіх і бросавых зямель. Раённы камітэт сялянскіх тавариствоў узгадамадамогі склаў **19 дружын для дапамогі бядняцкім гаспадаркам.** Аднак, **да гэтага часу яшчэ ня выяўлена, хто адчувае патрэбу ў гэтай дапамозе.**

Неабходна спыніцца і на іншых ненармальнасьцях. Адзін з дэлегатаў райпартканфэрэнцыі заявіў, напрыклад, наступнае. **«Замкнутасьць калгасаў дрэнна адбіваецца на ходзе дапейшай калектывізацыі».** Гэтая заява зусім правільная і адносінах раду калгасаў, якія не разумеюць, што яны абавязаны дапамагчы маламоцным гаспадаркам і весьці ўпартую штодзённую работу за ўцягваньне ў калектывы індывідуальных бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Вызумоўна, у гэтых ненармальнасьцях у значнай меры вінаваты кіруючыя працаўнікі раёну. У радзе месц раёну ня лічаць зусім патрэбным весьці работу з беднатой, якая не ўвайшла ў калгас.

На партканфэрэнцыі рабочы-калгасьнік—сормавец адкрыта заявіў, што «з беднатой-некалгасьнікамі мы не працуем». У калгасах-жа работа з беднатой арганізацыйна таксама настаўлена неправільна. Большасьць батрацка-бядняцкіх груп складаецца з сучых бедноты. Ёсьць выпадкі, калі на пасяджэньні бядняцкіх груп не пускаюць сераднякоў.

Значна адстае ў раёне кантрактацыя, асабліва ільну. На 6-та мая было закантрактавана 550,5 гэкт. ільну, а заданьне складае 1.400 гэкт. Ня лепш з кантрактацыяй бульбы.

У заключэньне аб кіраўніцтве акруговых устаноў Калгассаюзу, Паляводсаюзу, Малжывсаюзу і г. д. Раённая сетка гэтых арганізацый трапчыць ад напаровай хвалі. Кожная акруговая ўстанова завальвае патокам паперы сваю раённую арганізацыю. Пры чым, паміж інструкцыямі, якія даюцца акруговымі арганізацыямі раённым няма ніякай увязкі. Ня гледзячы на тое, што яны часта гавораць аб адным і тым-жа. Гэткае-ж зьявішча і на ўзаемаадносінах паміж раённымі арганізацыямі і калгасамі. Калгасы скарджацца: «шлюць адносіну аб пабудове будынку для птушак, а на адвароце адносіны—схема пабудовы цялятніку, вось і працуй».

У кожным сельсавеце ёсьць праўленьне куставога аб'яднаньня калгасаў, на якое ўскладзены абавязак кіраваць вытворчай работай калектыву. На справе-ж кусты зьяўляюцца толькі перасыльнымі пунктамі паперак, якія атрымліваюцца з раёнаў. Адно з двух: або трэба кустом сапраўды надаць функцыі кіраўнікоў вытворчасьцю калгасаў, або іх трэба распусьціць.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Сілосным культурам не аддаецца ўвагі

МАЗЫР. (Па тэлеграфу ад наш. кар.). На 10-га мая плян сяўбы кукурузы выкананы калгасамі на 27 проц., сланэчніку — на 11 проц.; індывідуальным сэктарам — кукурузы засеяна 18 гэктараў, сланэчніку — 1 гэкт.

Сяўбе сілосных культур не аддаецца патрэбнай увагі. Цікава адзначыць, што нават плян земорганаў не прадугледжане пашырэньня гэтых культур на Мазырчыне.

ВАПЕЛЬНІК.

Насенная бульба не рэалізуецца—невядома цана

АСЬВЕЯ, Полацкай акр. **(Па тэлеграфу).** Прыбыла насенная бульба. Попыт на яе вялікі. З прычыны неўказаньня адпускных цэн, ня можам пачаць яе рэалізацыю. Просім прыняць тэрміновыя меры.

Асьвейскі райкалгассаюз.

Ад рэдакцыі: Чакаем ад Белпаляводсаюзу паведамленьня аб прынятых мерах.

ЯШЧЭ АБ АРШАНСКІХ ПРАРЫВАХ

«Зьвязда» ўчора пісала аб прарывах сяўбы па Аршаншчыне. Выразным доводам таго, што сяўба ў Аршанскай акрузе ў цэлым праходзіць нездавальняюча, сьведчыць той факт, што на 10-та мая самая паўночная ў БССР акруга—Полацкая абагнала больш паўднёвую—Аршанскую. Даныя аб значным адставаньні індывідуальных гаспадарак у Аршанскай акрузе таксама былі зьмешчаны ў «Зьвязьдзе». Тут мы падамо рад новых фактаў, якія сьцьвярджаюць, што прарыў на Аршаншчыне тлумачыцца недапушчальным ігнараваньнем індывідуальнага сэктару, працягваньнем перагібаў у новых формах.

Ня гледзячы на тое, што сяўба ў Аршаншчыне ўжо разгарнулася даўно, да гэтага часу яшчэ не рэалізавана насеньне, угнаеньне, с.-г. машыны і прылады. Усё гэта ляжыць на складах райпаляводсаюзаў. У некаторых раёнах ня прымаецца нават патрэбных мер да рэалізацыі ўсяго гэтага.

Залежы ўгнаеньня, насеньня і машын

Плян завозу ўгнаеньня ў Аршанскую акругу выкананы на 106 проц. Усяго завезена 23.931 тона ўгнаеньня, з якіх рэалізавана толькі 66 проц. Завезенае ў Дубровенскі раён угнаеньне цалкам ляжыць на складзе.

Плян завозу гатункова аўсу выкананы на 147 проц. Плян-жа адмены простага на чыста-гатункові авёс выкананы толькі на 62 проц. Коньскі, Коханаўскі і Расьнянскі раёны яшчэ нават не распачалі абмену, ня гледзячы на тое, што насеньне ўжо даўно завезена. Тлумачыцца гэта тым, што індывідуальнікі яшчэ зараз ня ўсюды ў акрузе ведаюць, што абмен праводзіцца ня толькі з калгасамі, але і з індывідуальнымі бядняцка-сераднякімі гаспадаркамі.

Ня лепшы малюнак з рэалізацыяй машын і с.-г. прылад. Нават радавыя сяўкі, у якіх адчуваецца вострая патрэба, валяюцца па складах і не выкарыстоўваюцца. З завезеных 193 шт. рэалізавана толькі 150 сяўрак.

У часе збожжаачысткі не хапала сартовак, на што скарджаліся многія раёны. Між тым, з завезеных 167 сартовак рэалізавана толькі 72, з 121 трыера рэалізавана толькі каля 80. Плян рэалізацыі плугоў выкананы толькі на 78 процантаў, культыватараў на 23 проц.

Чым тлумачацца гэтыя зьявішчы? Чаму на складах раёнаў Аршаншчыны валяюцца машыны, угнаеньне і насеньне, у якіх сялянства гэтэта-ж раёну адчувае значную нястачу?

Недастатковая папулярызацыя мерапрыемстваў партыі і ўраду

Аршанскія работнікі забыліся аб індывідуальным сэктары і ня прымалі ніякіх крокаў, каб забясьпечыць поўнае выкананьне пасеўнага пляну індывідуальнікамі. Гэтую вялізарную памылку не паправілі нават і тады, калі выявілася, што індывідуальны сэктар складае больш 80 проц. гаспадарак акругі. Тое, што на сёньняшні дзень сяўбы яшчэ не пачалі больш 1.100 двароў, сьведчыць аб тым, што перагібы ў радзе месц Аршаншчыны працягваюцца і зараз. Аршанскае кіраўніцтва не прыняло патрэбных мер да папулярызацыі дырэктыў партыі і ўраду аб ільготах тым індывідуальным гаспадаркам, якія пашыраць сваю плошчу і ажыцьцёвяць тыя, ці іншыя агра-мерапрыемствы. Гэта выразна даводзіцца тым, што толькі зараз індывідуальнікі даведваюцца, і то ня ўсюды, аб тым, што і яны маюць права купляць с.-г. інвэнтар, угнаеньне, насеньне. Крэдыты нават калгасам не скарыстаны поўнасьцю. Што-ж дзівіцьцяць індывідуальнікаў, дык ім ня было паведамлена ў большасьці месц, што яны могуць атрымаць крэдыт на набыцьцё машыны, угнаеньня і насеньня.

Перагібы пры ўладатканьні

У сваім часе ў друку даволі пісалася аб перагібах у адносінах да серадняка на Аршаншчыне. Вось факты, якія сьведчаць, што перагібы ў адносінах да серадняка маюць месца ў паасобных мясцох і зараз. Гэта зьвязана ўжо з ападаткаваньнем на 1930-31 г. У вёсцы Забалоцьце, Вора-Вайшанскага сельсавету, Аршанскага раёну (г. зн. пад бокам у аршанскага акруговага кіраўніцтва) некалькі сераднякоў індывідуальна ападаткаваны. Падставай для гэтага фактычна зьявіла ся толькі тое, што ападаткаваныя зараз індывідуальна на сераднякі ўвесь час не жадалі ўступіць у калгас.

У Машкоўскім сельсавеце серадняк Пагадзевіч ападаткаваны сельсаветам індывідуальна толькі таму, што яго сын зьяўляецца селькорам і ўе на недахопах у рабоце сельсавету. З гэтае прычыны парашылі Пагадзевіча «крыху правучыць», як сказаў сакратар гэтага сельсавету Глінскі—сын... жандара. Калі сельсавет паставіў пытаньне аб індывідуальным ападаткаваньні Пагадзевіча на групе беднаты, дык уся беднота выказалася супроць гэтага. Каб усё-ж дабіцца свайго, старшыня і сакратар сельсавету правялі індывідуальнае ападаткаваньне Пагадзевіча праз плесум сельсавету. Ніякіх падстаў для індывідуальнага ападаткаваньня Пагадзевіча няма, ён ня мае наёмнай працоўнай сілы і ніякіх непрацоўных прыбыткаў.

Цікава адзначыць, што пашыраныя перагібамі ў адносінах да серадняка ў тым-жа самым Машкоўскім сельсавеце наглядаюцца **прызнаныя адносіны да кулацтва. Кулакі прапезьлі ў мясцовы калгас і верхаводзяць ім.** Калгасьнікам стаў былы буйны кулак, амаль намесьнік Тамашэвіч і кіраўнік яго маёнтку Мяжэвіч. Пры натуральнай сельсавету яны **рашэ** разьвярнулі сваю маемасьць, самараскулачыліся, а потым і ўступілі ў калгас. Сельсавет не ападаткаваў іх нават індывідуальна. Аднакавова Машкоўскі сельсавет індывідуальна ападаткоўвае і раскулачвае батрака, які толькі пры савецкай уладзе атрымаў зямлю, за тое, што з прычыны хваробы жонкі ён ня можа працаўніка на некалькі дзён.

Слабая праца з беднатой

У сьвятле гэтага асабліва значэньне набывае тое, што беднота ў радзе раёнаў Аршаншчыны ўсё яшчэ слаба арганізавана, што з ёю сталі работа рэдка дзе вядзецца. Не працуюць фактычна і батрацка-бядняцкія групы ў калгасах. У некаторых раёнах (Мсьціслаўскім, Круглянскім) лічыць арганізацыю групы беднаты ў калгасах справай непатрэбнай (аб гэтым у свой час пісалася ў «Зьвязьдзе».

У выніку такой правасапартуністычнай практыкі ў часе перавыбараў сельсаветаў на адным толькі Ляднянскім раёне было правалена 17 бядняцкіх кандыдатур, пры чым, нават беднякі за іх не галасавалі.

Зусім зразумела, што асноўная прычына таго становішча, якое зараз стварылася на Аршаншчыне заключаецца ў слабасьці работы з беднатой, у ігнараваньні ў радзе месц серадняка, у прымірэнчых адносінах у некаторых мясцох да кулака.

А. СЛАВІН.

Барацьба ў Індыі абвастраецца

СТАН АБЛОГІ Ў ШАЛАПУРЫ ЛУПЦАВАНЬНЕ — Ў ЯКАСЬЦІ МЕРЫ ПАКАРАНЬНЯ

ЛЁНДАН, 16. Віцэ-кароль Індыі лёрд Ірвінг выдаў дэкрэт аб увядзеньні стану аблогі ў Шалапуры (Бамбэйская правінцыя). Дэкрэт упоўнаважвае ваенныя ўлады ўвесьці рад адміністрацыйных мер. У ліку гэтых адміністрацыйных мер уваходзяць: забарона сьцягаў нацыянальнага кангрэсу, забарона выхаду на вуліцы пасьля поўнае гадзіны з правам расстрэльваць усіх, хто спрабуе ўнікнуць арышту, забарона так званых «шапак Ганды», забарона харчовых перадач арыштаваным за ўдзел у хваляваньнях, забарона зьбірацца ў колькасьці больш 5 чал., прадстаўленьне ваенным уладам права ліквідацыі транспартных сродкаў, маемасьці, а таксама мабілізацыі на прымусовыя работы. **У дадатак да грамадзянскіх судоў у Шалапуры будуць створаны асобныя ваенныя суды. У якасьці меры пакараньня ўводзіцца лупцаваньне.**

СЯЛЯНСКІЯ АТРАДЫ ЧЫРВОНЫХ ДОБРААХВОТНІКАЎ

ЛЁНДАН, 16. Сялянскі рух у Паўночна-Заходняй пагранічнай правінцыі Індыі працягваецца з вялікай упорлівасьцю. У вёсках фармуюцца атрады чырвоных добраахвотнікаў. Добраахвотнікі руйнуюць чыгункі, перарэзваюць тэлеграфныя правады і робяць барыкады з каменьняў і сьсечаных дрэў на сельскіх дарогах і вуліцах у вёсках. Паліцыя арганізуе налёты на вёскі, робячы вобыскі і прабуючы разброіць сялян. У пагранічным раёне, пры палёце ангельскіх самалётаў, адзін апарат зваліўся. Два лётнікі забіты.

ДА ЧАГО ДАХОДЗІЦЬ «БЕССИЛИЕ» ПАЛІЦЫІ

ЛЁНДАН, 15. Як тэлеграфуюць з Бамбэі, паліцыя ўжывала ў барацьбе з добраахвотнікамі, якія накіроўваліся да саляных складаў у Дхарсане нясупраціўленцкія мэтады Ганды. Паліцэйскія ляглі на зямлю і сваімі целамі загарадзілі добраахвотнікам дарогу.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ

ЛЁНДА

Што атрымалі казакі ад Турксібу

На станцыі Алма-Ата атрыманы розны с.-г. інвэнтар для разьмеркаваньня па калгасах Казакстану. На здымку жняяркі на ст. Алма-Ата

Грабёж беспрацоўных ў Нямеччыне

Новая атака на апошнія капейкі беспрацоўных

БЭРЛІН, 16. Дзяржаўнае кіраўніцтва па страхаваньні ад беспрацоўя, на чале якога стаіць сацыял-дэмакратычны прафсаюзны кіраўнік, разам з прадпаводле ўказаньня Ураду Брунінга, праект аб зьніжэньні дапамогі беспрацоўным. Праект будзе ў бліжэйшы час унесены ў рэйхстаг з тым, каб ён уступіў у моц з 1-га ліпеня. Самым істотным у праекце зьяўляецца пункт, унесены прускім урадам, які кіруюць сацыял-дэмакраты. На моцы гэтага пункту, беспрацоўным, якія не прапрацавалі, перад тым бесьперапынна 52 тыдні, будзе выдавацца не дапамога па беспрацоўі, а так званая крызысная дапамога і то толькі канфіскаваная, калі па надыходу беспрацоўя яны працавалі без перапынку 26 тыдняў. Такім чынам, рабочыя, якія ў выніку працяжнага эканамічнага крызісу ня могуць атрымаць пастаянную работу, не атрымаюць поўнае дапамогі па беспрацоўі. Маладыя рабочыя 18 год і рабочыя старэй за 65 г., паводле праекту, не атрымаюць ніякае дапамогі. Дапамога замужнім работніцам скарачаецца напалову. Калі іх мужы карыстаюцца дапамогаю. Узносы ў касу страхаваньня ад беспрацоўя павышаюцца да 4 проц., што ляжа вялізарным цяжарам на рабочых, занятых на вытворчасьці.

Дзяржаўнае кіраўніцтва мяркуе ўсімі гэтымі мерапрыемствамі з'эканоміць грошы дзяржаўнай казне у 62 млн. марак. «Рогэ Фане» канстатуе, што правадыры сацыял-дэмакратаў і прафбюракраты нічога рашуча ня прымаюць для таго, каб перашкодзіць новай небачанай атацы на апошнія капейкі беспрацоўных.

Маніфэст ангельскай кампартыі у сувязі з падзеямі ў Індыі

ЛЕНДАН, 16. У сувязі з падзеямі ў Індыі ангельская кампартыя выпусьціла маніфэст. Маніфэст зварачаецца да ўсіх працоўных і дае ацэнку рэвалюцыйнаму руху, які ахапіў Індыю. Зварачаючыся да ангельскіх рабочых, маніфэст заклікае іх дэманстраваць сваю салідарнасьць з працоўнымі масамі Індыі і патрабаваць вываду ўсіх ангельскіх войск з Індыі.

Далей маніфэст, напамінаючы аб мірускіх абяцаньнях, гаворыць: «Ня гледзячы на тое, што лідэры кінуты ў турму, індыйскі пралетарыят арганізуе адну забастоўку за другою, даўёў сваё гэраічнае рашэньне — змагацца і весьці за сабою сялянства. Індыйская нацыянальная буржуазія з незадаваленьнем убачыла, што кіраўніцтва рухам выпадае з яе рук. Таму Ганды, у інтарэсах індыйскіх капіталістых, якія жадаюць атрымаць большую значную долю прыбытку ад эксплёатацыі індыйскіх мас, высунуў праграму несупраціўленцкага грамадзянскага непаслухмяньства. Ня гледзячы на яго стараньні, рух выпаў з-пад яго кіраўніцтва. Пад кіраўніцтвам індыйскага пралетарыяту і Індыйскай кампартыі, аб'яднаная рэвалюцыйная барацьба працоўных мас прывядзе да распаду ангельскага імпэрыялізму. Падрыхтуйце ўсеагульную забастоўку супроць рабочага ўраду. Арганізуйце рэвалюцыйныя сялянскія камітэты. Праганяйце памешчыкаў з зямлі, якую яны займаюць, не плацеце падаткаў і процантаў, скінеце ярмо ангельскіх імпэрыялістых шляхам дэмакратычнай рэвалюцыі індыйскага пралетарыяту і сялянства».

Маніфэст зварачаецца да рабочых Эўропы і Амэрыкі з заклікам падтрымаць у ваніе індыйскія масы за іх незалежнасьць.

„ПАН-ЭЎРАПЭЙСКАЯ" КАМЭДЫЯ—З АНТЫСАВЕЦКІМ УХІЛАМ

ЖЭНЭВА, 15. Першая «пан-эўрапэйская канфэрэнцыя» адбудзецца ў Жэнэве ў часе верасьнёўскага пленуму Лігі Нацый. Анкета Брыяна, якая ў сувязі з гэтым будзе заўтра раздана ўсім эўрапэйскім членам Лігі Нацый, адзначае неабходнасьць агульна-эўрапэйскіх згод па эканамічных і тэхнічных пытаньнях, як напрыклад, па пытаньні абмену статыстычнымі данымі адносна прамысловай прадукцыі, уводу побач з нацыянальнымі валютамі агульна-эўрапэйскай валюты, спрашчэньне сыстэмы пашпартных візаў і г. д. «У верасьні Брыян спадзяецца стварыць бачанасьць «закладкі першага камяню эўрапэйскай канфэрэнцыі», што магло-б прыдацца Францыі ў будучым у мэтах згуртаваньня Эўропы пад сваім кіраўніцтвам супроць СССР, а таксама супроць ПАЗШ і ўсіх магчымых па-закантынэнтальных ворагаў францускага імпэрыялізму. (ТАСС).

ЛІСТОЎКА РЭНЭГАТАЎ

БЭРЛІН, 14. На сэсіі II Інтэрнацыяналу ў Бэрліне пашыраліся лістоўкі па індыйскім пытаньні рэнэгатамі з групы Роя, якая належыць да брандлераўцаў. У лістоўцы адсутнічае патрабаваньне незалежнасьці і неадкладнай эвакуацыі ангельскіх войск з Індыі і ні слова не гаворыцца аб патрабаваньнях рабочае клясы і працоўнага сялянства. Лёзунгі лістоўкі зводзяцца да патрабаваньня адмены рэпрэсій, адкліканьня цяперашняга віцэ-караля і, нарэшце, скліканьня ўстаноўчага сойму для выпрацоўкі індыйскай канстытуцыі. Адкрыты ліст групы Роя зьяўляецца поўнай капітуляцыяй перад гандызмам, у момант, калі сам гандызм пацярпеў поўны крах у Індыі. (ТАСС).

Мукдэн ліхаманкава ўзбройваецца

ТОКІЁ, 15. Японскія газэты, якія выдаюцца ў Дайрэне, перадамплюць, што Мукдэн ліхаманкава ўзбройваецца. У Эўропе і Амэрыцы непарыўна купляецца зброя. Гэтымі днямі ў Дайрэне адгружана для мукдэнскага ўраду 7 французкіх самалётаў новейшай канструкцыі. З Францыі запрашаны авіятары і спэцыялістыя па авіяцыі.

33 ДЗЯРЖАВЫ ПРАТЭСТУЮЦЬ СУПРОЦЬ ПАВЫШЭНЬНЯ МЫТАЎ ПАЗШ

ВАШЫНГТОН, 14. 33 дзяржавы, у тым ліку Канада, Англія, Францыя, Нямеччына, Італія, Японія, Аўстралія, а таксама галоўныя дзяржавы Лацінскай Амэрыкі ўжо заявілі дзяржаўнаму дэпартаманту (міністэрства замежных спраў) ПАЗШ пратэст супроць павышэньня мытаў у ПАЗШ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

НАПЯРЭДАДНІ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Раённыя канфэрэнцыі праходзяць пад знакам вялікай палітычнай актыўнасьці на аснове бальшавіцкай самакрытыкі

Кастрычніцкая партканфэрэнцыя

ДАКЛАД РК КП(б)Б

Пазаўчора канфэрэнцыя скончыла абмеркаваньне дакладу тав. Дамброўскага аб рабоце Менскай АКК КП(б)Б. Па дакладу выказалася 8 чал. Канфэрэнцыю вітала дэлегацыя рабочых **Менскага** чыгуначнага вузлу. Дэлегацыя падала ў прэзыдыум калектыўную заяву 35 чыгуначнікаў аб уступленьні ў рады партыі. Канфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), «**Правде**» і «**Зьвязьдзе**».

***

Канфэрэнцыя заслухала справаздачны даклад раённага камітэту КП(б)Б. Дакладчык **тав. Дзічкоўскі** спыніўся на асноўных пытаньнях работы Кастрычніцкага РК КП(б)Б і раённай партарганізацыі.

Самакрытыка ў Кастрычніцкім раёне, сказаў дакладчык, часта насіла парадную форму. У радзе выпадкаў самакрытыка ня была накіравана на выкрыцьцё прычын таго ці іншага прарыву. Напрыклад, мы мелі факты, калі, замест выкрыцьця прычын прарываў у выкананьні прамфінпляну, асобныя работнікі займаліся «очковтирательством» і супраціўляліся выкрыцьцю памылак і прарываў. Такія факты былі на гарбарні «Бальшавік» і на заводзе «**Чырвоная Зара**».

Тав. Дзічкоўскі падкрэсьліў, што РК і партарганізацыя невыстарчальна змагаліся за прамфінплян. Рабочыя масы былі слаба мабілізаваны на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне пляновых заданьняў. Прамфінплян па прадпрыемствах раёну выкананы толькі па 90,6 проц. Партыйная арганізацыя павінна мабілізаваць усе свае сілы, каб дабіцца поўнай ліквідацыі прарываў і перавыканаць прамфінплян.

Гаворацы аб росьце партарганізацыі, дакладчык заявіў, што ў гэтым напрамку арганізацыя дабілася бясспрэчных посьпехаў. У мінулую партканфэрэнцыю ў Кастрычніцкай арганізацыі рабочыя складалі 69 проц., сяляне 11 проц. і рэшту—іншыя. На сёньняшні дзень Кастрычніцкая арганізацыя мае рабочае ядро ў 74 проц. З гэтага ліку 50,68 проц.—рабочыя ад варштату.

У заключэньне дакладчык гаварыў аб пытаньнях партвучобы і падрыхтоўкі новых кадраў.

***

Канфэрэнцыя актыўна абмеркавала пытаньні работы раённай камсамольскай арганізацыі, работу партыйнай тройкі пры РК КП(б)Б і г. д.

КАСТРЫЧНІЦКАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ ЦК УсеКП(б) І ТАВ. СТАЛІНУ

3-я партыйная канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну (Менскай арганізацыі КП(б)Б) шле шчырае бальшавіцкае прывітаньне ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б).

Дзякуючы цьвёрдаму бальшавіцкаму кіраўніцтву Цэнтральнага Камітэту, партыя атрымала вялізарныя посьпехі ў барацьбе супроць правага ўхілу, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, таксама і «левага» апартунізму, у барацьбе за выкананьне пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі, у справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі, у справе барацьбы за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Своячасовая і рашучая барацьба Цэнтральнага Камітэту з усякага роду перагібамі і скажэньнямі генэральнай лініі партыі ў галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі забясьпечыла магчымасьць мабілізаваць усю партыйную масу і рабочую клясу на барацьбу з гэтымі скажэньнямі.

Райпартканфэрэнцыя з бальшавіцкай простасьцю выкрывае ўсе дапушчаныя памылкі нашых партарганізацый для таго, каб мабілізаваць усю арганізацыю па барацьбу за далейшае правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, на выпраўленьне дапушчаных памылак.

Наша арганізацыя ідзе згуртаванымі радамі да XVI зьезду УсеКП(б) і запоўніе ленінскі ЦК, што Кастрычніцкая райпартарганізацыя зьяўляецца і будзе зьяўляцца надалей цьвёрдай апорай Цэнтральнага Камітэту ў яго змаганьні за ленінскую лінію партыі, у бязьлітаснай барацьбе як супроць правага ўхілу, так і супроць небясьпекі, так і «левых» загібаў, якія вядуць да шляху правага апартунізму.

Няхай жыве ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б)!

Няхай жыве XVI зьезд УсеКП(б)!

УСІМ ЧЛЕНАМ і КАНДЫДАТАМ КП(б)Б,

членам ЛКСМБ і беспартыйным рабочым і служачым

неабходна мець на ўвазе, што ў чэрвені—ліпені ў «ПРАВДЗЕ» будуць друкавацца найбольш поўна справаздачы аб XVI ПАРТЗЬЕЗЬДЗЕ, у сувязі з чым чакаецца вялізарны рост тыражу «ПРАВДЫ», які прызначаецца ў першую чаргу для падпісчыкаў. У розьнічны продаж газэта будзе паступаць у абмежаванай колькасьці.

Усім жадаючым атрымліваць «ПРАВДУ» штодзенна за час ЗЬЕЗДУ, трэба падпісацца загадзя на чэрвень—ліпень да 25 мая г. г.

Беларускае аддзяленьне «ПРАВДА»
Савецкая, 61.

ПЕРАВЫБАРЫ ІДУЦЬ

ВІЦЕБСК. XII канфэрэнцыя 2-й гарадзкой партарганізацыі прайшла пад знакам шырока разгорнутай самакрытыкі. Канфэрэнцыя заслухала даклад тав. **Ігнатовіча** аб рабоце раённага камітэту партыі. Дакладчык падкрэсьліў, што за час з XI раённай партканфэрэнцыі партыйная арганізацыя дабілася бясспрэчных посьпехаў. Рост прамысловасьці ў параўнаньні з мінулым годам дае павялічэньне на 78 проц. Колькасьць рабочых павялічылася на 33 проц. Рад асноўных прадпрыемстваў пераведзен на 7-гадзінны рабочы дзень. Арганізацыя рашуча змагалася з правым і «левым» апартунізмам, даючы бязьлітасны адпор усялякім адхіленьням ад лініі партыі.

Дакладчык завастрыў увагу канфэрэнцыі на прарывах выкананьня прамфінпляну. Па прадпрыемствах раёну прамфінплян у сярэднім ня выкананы на 3 проц. Партыйныя ячэйкі і ФЗМК яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці, ня здолелі мабілізаваць рабочых мас на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. На заводах і фабрыках раёну прамфінплян не даведзен да варштату. Невыстарчальна праводзіцца папулярызацыя пяцігодкі. Толькі 57 проц. камуністых прымае ўдзел у спаборніцтве.

Дэлегаты канфэрэнцыі ў спрэчках па дакладу РК крытыкавалі работу раённага камітэту. У спрэчках прынялі ўдзел 30 чал. Тав. **Мялешка** гаварыў аб прарывах на акулярнай фабрыцы. Ён адзначыў, што прагулы рэзка б'юць на выкананьні прамфінпляну.

Тав. **Рабкін** адзначыў, што справаздачна - перавыбарчая кампанія парторганаў у раёне праведзена нездавальняюча. Перавыбары бюро ячэек былі закончаны на працягу двух тыдняў. Такая насьпешнасьць адбілася на якасьці справаздачна - перавыбарчых сходаў.

Тав. **Шок** заявіў, што райком не пазрэджваў прарываў у выкананьні прамфінпляну. РК нерашуча і несвячасова рэагаваў на факты цкаваньня рабкораў.

Сакратар Віцебскага АК КП(б)Б тав. **Чычэраў** адзначыў, што вялікім прарывам у рабоце райкому зьяўляецца недавыкананьне прамфінпляну. Тав. Чычэраў рашуча падкрэсьліў, што частка партыйцаў і камсамольцаў яшчэ да гэтага часу не жадае прымаць удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве. **Треба** поўнасьцю выканаць дырэктыву ЦК УсеКП(б) аб 100-процантным уступленьні камуністых і камсамольцаў ва ўдарныя брыгады.

Канфэрэнцыя прызнала палітычную лінію раённага камітэту правільнай. У склад новага РК канфэрэнцыя выбрала звыш 40 чал. Першы пленум раённага камітэту выбраў сакратаром РК тав. **РЭЗЬНІКАВА.**

20-га мая адкрываецца VI акруговая канфэрэнцыя Віцебскай арганізацыі КП(б)Б. Канфэрэнцыя абмяркуе даклады ЦК і ЦКК КП(б)Б і справаздачу АК і АКК КП(б)Б. Апрача таго канфэрэнцыя заслухае даклады аб задачах прафсаюзаў і аб калгасным будаўніцтве. На канфэрэнцыі таксама будуць праведзены выбары дэлегатаў на XIII зьезд КП(б)Б і XVI зьезд УсеКП(б).

МАГІЛЕЎ. Закончылася раённая партканфэрэнцыя Быхаўскай арганізацыі. Канфэрэнцыю вітали дэлегацыі ад рабочых, чырвонаармейцаў, калгасьнікаў і прафсаюзных арганізацый. Рабочая дэлегацыя ад гуты «Ільліч» рапартавала канфэрэнцыі аб выкананьні прамфінпляну. Дэлегацыя далажыла канфэрэнцыі, што гута **«Ільліч»** выканала прамфінплян на 106,5 проц. Спэцыялістыя сельскай гаспадаркі, вітаючы партыйную канфэрэнцыю, абвясьцілі сябе ўдарнікамі ў правядзеньні веснавой сяўбы.

Канфэрэнцыя заслухала даклады акруговага партыі, АКК КП(б)Б і справаздачу раённага камітэту. Трэба рашуча падкрэсьліць, што ў спрэчках па дакладу раённага камітэту ня была шырока разгорнута самакрытыка. Частка т. т. імкнулася змазаць і апраўдаць памылкі і перагібы, дапушчаныя ў раёне пры правядзеньні калектывізацыі.

Адкрылася IX партыйная канфэрэнцыя Магілеўскай гарадзкой арганізацыі. Канфэрэнцыя абмяркуе даклады АК і АКК КП(б)Б і справаздачу раённага камітэту. Канфэрэнцыя заслухае таксама даклад аб выкананьні прамфінпляну.

ПОЛАЦАК. У сувязі з акруговай канфэрэнцыяй, якая адкрываецца 20-га мая, на гарадзкой арганізацыі адбываюцца куставыя сходы. Куставыя сходы абмяркоўваюць даклады акруговага камітэту партыі.

ПАМЫЛКІ ВЫПРАВІМ

(ГРЭСК)

Скончылася раённая канфэрэнцыя **Грэскай** партарганізацыі. Канфэрэнцыя прайшла пад знакам рашучага прызнаньня і выпраўленьня памылак і перагібаў, дапушчаных у раёне пры арганізацыі калгасаў.

Раённае кіраўніцтва старога складу скажала партыйную лінію, няправільна арыентавала партыйную арганізацыю ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва і ўпарта не жадала выпраўляць сваіх памылак і перагібаў. На выгаду кулаку, не жадаючы прызнаваць сваіх праваапартуністычных памылак і «левых» перагібаў, раённае парткіраўніцтва ня спынила скажаць партыйнай лініі. Былы сакратар РК Уласэвіч (зараз выключаны АК з партыі) на нарадзе партактыву заяўляў: «хто ня здолее да пачатку сяўбы правесьці калектывізацыю ў сельсавеце на 100 проц., — той будзе выключан з партыі, як элемэнт, які не праводзіць партыйнай лініі (??)».

Партыйцы, якія імкнуліся выправіць памылкі і скрыўленьні, абвінавачваліся раённымі кіраўнікамі ў... правым апартунізьме. Дэлегаты канфэрэнцыі заявілі, што Менскі АК правільна і рашуча ўдарыў па раённым парткіраўніцтве. Канфэрэнцыя аднадушна ўхваліла пастановы Менскага АК КП(б)Б аб скрыўленьнях партыйнай лініі ў раёне.

Некаторыя дэлегаты адкрыта з трыбуны канфэрэнцыі прызналі дапушчаныя імі памылкі і заявілі, што яны зробяць усё, каб у хутчэйшы тэрмін поўнасьцю ліквідаваць гэтыя памылкі.

Трэба адзначыць, што Грэская партыйная арганізацыя рашуча ўзялася за выпраўленьне дапушчаных ёю памылак і перагібаў. Партыйная арганізацыя **дабілася замацаваньня калгасаў і выстарчальных тэмпаў правядзеньня веснавой сяўбы.**

Іа.

БАЛЬШАВІЦКІМ ТЭМПАМ

(БАБРУЙШЧЫНА)

Партыйная ячэйка камуны імя **Сталіна** падыходзіць да XIII зьезду КП(б)Б з вялікімі дасягненьнямі. Ячэйка, на хаду перабудоўваючы сваю работу, дабілася сур'ёзных дасягненьняў у калгасным будаўніцтве і аб'ядная вакол слабе моцных батрацкі і бяднацка-серадняцкі актыў.

***

З першых дзён свайго існаваньня (верасень 1929 г.) партыйная ячэйка паставіла перад сабою адну асноўную задачу — барацьбу за калгас. Сталінскіх камуністых не спалохалі вялікія труднасьці. Яны энэргічна і рашуча змагаліся за ўмацаваньне камуны. Упартасьць і настойлівасьць ячэйкі перамаглі. Камуна вырасла і ўмацнілася. У камуну шырока разгарнулася гаспадарчае будаўніцтва. Ідзе пабудова крухмальнага заводу. Будуецца цагельня. Да восені 1930 году камуна пабудуе свой уласны параны млын. Будуецца свінкі бэконны гадавальнік. Камуна абарачаецца ў магутны гаспадарчы арганізм. Для камунараў, якія раней жылі ў хлявох, пабудаваны новыя дамы.

Эканамічная база камуны з кожным днём мацнее. Асноўны ўхіл гаспадаркі камуны імя Сталіна — жывёлагадоўля. Таму камунары аддаюць самую сур'ёзную ўвагу тэрміну пытаньню. Апрача пабудовы буйнага бэконнага гадавальніка, у камуне пабудаваны новы двор для рагатае жывёлы, новая стайня і г. д. Стада ў гаспадарцы камуны дасягае некалькіх соцень штук.

Гэтых дасягненьняў камунары дабіліся пад кіраўніцтвам сваёй парт'ячэйкі. Партыйная ячэйка здолела правільна кіраваць жыцьцём камуны. Арганізацыя працы, вытворчыя пляны, сацыялістычнае спаборніцтва, пасёўная кампанія былі і ёсьць асноўнымі пытаньнямі ў рабоце парт'ячэйкі. Ячэйка своячасова паставіла пытаньне аб арганізацыі працы ў камуне. Распрацаваны ячэйкай і праўленьнем камуны плян арганізацыі працы быў аднагалосна ўхвален усімі камунарамі. Выразная арганізацыя працы забясьпечыла добрую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

У камуне створаны ўдарныя брыгады, якія ўступілі паміж сабою ў сацыялістычнае спаборніцтва за лепшую работу на будаўніцтве і за баявую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Ячэйка не абмежавалася толькі тым, што дабілася арганізацыі ўдарных брыгад і ўступленьня камунараў у сацыялістычнае спаборніцтва. Надаўна партыйная ячэйка правяла праверку, наколькі ўдарныя брыгады па справе працуюць ударна. Праверка паказала, што ўдарныя брыгады па-баявому праводзяць веснавую сяўбу. Сяўба ў камуне, за выключэньнем аднэй культуры, ужо закончана. Плян веснавой сяўбы поўнасьцю выкананы.

Камунары паказалі прыклад вакольнаму бяднацка-серадняцкаму сялянству, скончыўшы сяўбу сілосных культур. Поўнасьцю выканан плян сяўбы па буракох, кукурузе і слоначніку. Гэтымі днямі камуна імя Сталіна прыступіла да будаўніцтва сілоснай вежы на 25 тон сілоснай масы.

Умацніўшы камуну, згуртаваўшы камунараў у адзіны калектыў, партыйная ячэйка адначасова ўнарта агітавала за калектывізацыю сярод навакольных бяднацка-серадняцкіх мас. Сёньня ячэйка быў арганізаваны калгас «**КАМІНТЭРН**» на плошчы ў 300 гэктараў. Камуна, на чале з парт'ячэйкай, штодзенна дапамагала калгасьнікам «Камінтэрну» паладзіць арганізацыю працы і падрыхтавацца да веснавой сяўбы. Камунары адрамантавалі калгасьнікам усе плугі і бароны. Пры дапамозе камуны «Камінтэрн» добра падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Сяўба ў калгасе праходзіць з посьпехам. Зараз плян засеву яравых цалкам выкананы.

***

Ячэйка камуны імя Сталіна абрастае моцным калгасным актывам. Перадавых камунараў і калгасьнікаў-актывістых ячэйка падрыхтоўвае да ўступленьня у КП(б)Б. За 8 месяцаў ячэйка вырасла больш чым у тры разы.

Зараз зноў 10 батракоў і бяднякоў падалі заявы аб уступленьні ў партыю. Падаюць заявы аб уступленьні ў партыю і батракі, якія ўпайшлі ў калгас «Камінтэрн». У калгасе «Камінтэрн» стварэцца кандыдацкая група.

У сталінскіх партыйнаў трэба вучыцца, як праводзіць работу сярод батрацка-бяднацкіх мас і змагацца за калектывізацыю.

С.

Рэзалюцыя аб'яднанага пленуму Менскага АК і АКК КП(б)Б

(4—5 мая г. г.)

па справаздачы бюро акругкому КП(б)Б

Заслухаўшы справаздачны даклад сакратара акругкому КП(б)Б **т. Славінскага** аб рабоце бюро за перыяд ад 7-й акруговай партканфэрэнцыі, аб'яднаны пленум акругкома і акруговай кантрольнай камісіі прызнае палітычную і арганізацыйную лінію бюро правільнай, у асноўным адпавядаючай генэральнай лініі партыі і канстатуе, што Менская арганізацыя пад бальшавіцкім кіраўніцтвам акругкома і камітэту падыходзіць да VIII акруговай партканферэнцыі ідэалёгічна здаровай і бальшавіцка загартаванай.

У працягу справаздачнага перыяду акруговая арганізацыя вяла нясупынную рашучую барацьбу супроць галоўнейшай небясьпекі на гэтым этапе — ідэалёгіі правага ўхілу, праяўленьняў правага апартунізму на практыцы супроць «левых» скажэньняў Ленінскай лініі партыі, прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі і «левым» фразэрствам, якое лье воду на млын правых апартуністых і дапамагаючых імі месьці барацьбу супроць генэральнай лініі партыі.

За справаздачны перыяд партарганізацыя правяла рашучую барацьбу супроць нацыянал-апартунізму, нацыянал-дэмакратызму і шавінізму розных колераў (выступленьні групы нацыянал-дэмакратаў, скажэньне партыйнай лініі ў часе сьвяткаваньня юбілею Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і інш.). Парторганізацыя вяла вялізарную працу па растлумачэньні задач барацьбы з нацыянал-фашыцкай контр-рэвалюцыяй.

Менская арганізацыя рашуча асудзіла рэшткі буйдаўскай ідэалёгіі і ідэалізацыі Бунду што мела месца ў некаторых ячэйках, як справа Грынблата (ч. шпацінай фабрыкі і інш.).

Аб'яднаны пленум АК і АКК зварачае увагу ўсёй партарганізацыі на задачы далейшай бязьлітаснай барацьбы з ухілам ад Ленінскай лініі, правым апартунізмам, шибольш небясьпечным у сучасны перыяд, з «левымі» крыкунамі, якія пакідаючаць на партыю, ёлічы аб адступленьні партыі ў правядзеньні калектывізацыі, правале калектывізацыі і нават аб адмаўленьні партыі ад калектывізацыі.

І падалей партыйная арганізацыя панацыянал-дэмакратызмам, рашуча выкрываючы контр-рэвалюцыйную сутнал-фашысцкай контр-рэвалюцыяй.

Менская акруговая арганізацыя супольна з усёй партыяй ідзе да XIII зьезду КП(б)Б, XVI зьезду УсеКП(б) з буйнымі дасягненьнямі.

Правільная Ленінская лінія партыі, яе жалезная стойкасьць, цьвёрдасьць і пасьлядоўнасьць у барацьбе за канчатковую перамогу справы рабочае клясы — забясьпечыла вялікія посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, у выніку чаго тэмп разгортваньня прамысловасьці па Менскай акрузе, у асноўным, адпавядае задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці Менскай акругі ў 1928-29 годзе павялічылася на 46,4%. За 1-е паўгодзьдзе 1929-30 г. агульная прадукцыя ўзрасла на 93,3% (пры росьце прадукцыі па БССР на 72,1%), на мясцовай прамысловасьці прырост за 28-29 г. — на 57%, за 1-е паўгодзьдзе 1930 г.— 157%.

Рост прадукцыі зьвяўся вынікам бязупынкага павялічэньня капітальных укладаньняў, тэхнічнага пераабсталяваньня прамысловасьці, росту колькасьці рабочай сілы, пераводу 36% рабочых на 7-мігадзінны працоўны дзень, і ўзьнікцця прадукцыйнасьці працы.

Аб'яднаны пленум АК і АКК канстатуе значныя посьпехі ў галіне ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы і ўстанаўленьня параўнальна здавальняючых суадносін паміж прадукцыйнасьцю працы і зарплатай.

Адначасова пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае недавыкананьне прамфінпляну (за 1-е паўгодзьдзе на рэспубліканскай прамысловасьці выкана на 95,6%, па мясцовай за 1-шы квартал — 91%) таму, што партыйныя ячэйкі, прафарганізацыі і гаспадарчыя органы ня здолелі ў належнай ступені мабілізаваць увагу рабочае клясы на пытаньнях выкананьня прамфінпляну, не ажыцьцёвілі прынцыпу адзінаначальлі чым у значнай меры тлумачыцца прарыў 1-га кварталу і недавыкананьне прамфінпляну за 1-е паўгодзьдзе. Адначасова пленум адзначае, што колькасныя вынікі ў слабой ступені ішлі побач з паляпшэньнем якасьці прадукцыі, у радзе-ж выпадкаў якасьць прадукцыі ў параўнаньні з мінулым годам пагоршылася («Бальшавік», запалкавая прамысловасьць, «Кастрычнік» і інш.). Пленум канстатуе няпоўнае выкананьне пляновых заданьняў па зьніжэньні сабекошту прадукцыі (з 11% пазводзе пляновага заданьня выканана 8%), недастаткоую работу на мабілізацыі рэзэрваў прамысловасьці і барацьбе са стратамі, недастаткоую работу па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы для прамысловасьці.

Пленум даручае бюро АК прыняць самыя рашучыя меры да далейшага забясьпячэньня цьвёрдага кіраўніцтва ўсярмнага разьвіцьця сац. спаборніцтва і ўдарніцтва, як найлепшых мэтадаў у ажыцьцяўленьні прамфінпляну, хутчэйшай перабудовы партыйнай і прафсаюзнай работы, хутчэйшага правядзеньня ў жыцьцё адзінаначальля з тым, каб у працягу 2-га паўгодзьдзя перакрыць недавыкананьне прамфінпляну за 1-е паўг. і дабіцца выкананьня і перавыкананьня яго.

Адзначае, што на падставе росту індустрыялізацыі краіны, разьвіцьця актыўнасьці пралетарскіх і поўпралетарскіх мас вёскі, на падставе узмацненьня апоры рабочае клясы ў вёсцы (батрацтва і беднота), узмацненьня саюзу рабочае клясы з серадняком і непасрэднага ўдзелу рабочае клясы ў справе калектывізацыі, на падставе росту давер'я з боку батрацтва і бяднацка-серадняцкіх мас сялянства да камуністычнай партыі — разгарнуўся вялізарны калгасны рух, на падставе якога наша арганізацыя рашуча ажыцьцяўляла ў палітыцы партыі паварот ад палітыкі абмежаваньня (выцісьненьня) капіталістычных элемэнтаў вёскі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, у выніку чаго Менская арганізацыя мае пэўныя дасягненьні ў галіне калгаснага будаўніцтва і выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы.

Пленум з усёй бальшавіцкай рашучасьцю падкрэсьлівае, што ў практычнай рабоце па калектывізацыі было дапушчана рад памылак, перагібаў і яўных скрыўленьняў партыйнай лініі ў адносінах да серадняка як асобнымі раённымі арганізацыямі, так і акруговым кіраўніцтвам.

Гэтыя скажэньні партлініі выявіліся ў падмене прынцыпу добраахвотнасьці пры арганізацыі калгасаў голым адміністраваньнем, у забыцьці Ленінскага прынцыпу аб вахаваньні саюзу з серадняком, ва ўжываньні гвалту адносна серадняка, у раскулачваньні асобных сераднякоў, у забываньні таго, што асноўным зьвяном на даным этапе зьяўляецца сельска-гаспадарчая арцель, у імкненьні абагуліць ня толькі зямлю, жывы і мёртвы інвэнтар, насеньне, малочна-прадукцыйную жывёлу, але і дробную жывёлу, птушку, гародніна і сядзібныя землі, жыльлёвыя будынкі, іграванарные работы сярод батрацка-бяднацкіх груп, у правядзеньні раскулачваньня незалежна ад суцэльнай калектывізацыі, у паасобных выпадках падзелу кулакай маемасьці, раскулачваньні местачковых саматужнікаў і дробных гандляроў.

Корань гэтых памылак—ў няправільным падыходзе да серадняка, у дапушчэньні прымусу ў галіне гаспадарчых суадносін з серадняком, у забываньні таго, што гаспадарчая змычка з серадняцкімі масамі павінна будавацца не на падставе прымусовых мерапрыемстваў, а на падставе згоды з серадняком. У забываньні таго, што падставай калгаснага руху ў даны момант зьяўляецца саюз рабочае клясы і беднаты з серадняком супроць капіталізму наогул, супроць кулацтва ў асабліваści» (Сталін).

Пленум канстатуе, што не ва ўсіх арганізацыях артыкул т. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б), ЦК і АК КП(б)Б знайшлі адразу належнае праламленьне, а ў некаторых (Грэск) выпраўленьню лініі партыі было аказана сьвядомае скрытае супраціўленьне.

Канстатуе, што бюро АК КП(б)Б рэагавала на выначаныя скрыўленьні партлініі ў справе калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, і ў сваёй пастанове ад 4 лютага 30 г. папярэдзвала арганізацыю супроць адміністраваньня ў справе калектывізацыі, падмены калектывізацыі голым адміністрацыйным раскулачваньнем, правядзеньня раскулачваньня без апоры і папярэдняй работы сярод шырокіх бяднацка-серадняцкіх мас, супроць меўшых месца выпадкаў падзелу кулацкай маемасьці.

У сваіх пастановах ад 22 лютага 30 г. і ад 16 сакавіка бюро АК зноў дало рад указаньняў аб якасным замацаваньні арганізаваных калгасаў супроць пагоні за колькаснымі паказальнікамі, аб неабходнасьці ўзмацненьня работы з батратвам і беднатой, аб зьніжэньні выпадкаў прымусу над серадняком, аб парадку абагульненьня маемасьці і таварна-прадукцыйнай жывёлы і г. д. Акруговы камітэт прыняў рад рашучых мер па замене кіраўніцтвам, паказаўшых сябе ў працэсе калектывізацыі няздольнымі праводзіць бальшавіцкую лінію партыі (Грэск, Самахвалавічы, Плешчаніцы).

Пленум адзначае, што акруговы камітэт партыі ў працэсе кіраўніцтва калектывізацыяй сельскай гаспадаркі і ліквідацыяй кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі дапусьціў наступныя памылкі:

а) вызначэньне процанту калектывізацыі для асобных раёнаў;

б) вызначэньне два раёны суцэльнай калектывізацыі;

в) прыняў выклік Мазырскай партарганізацыі на сацыялістычнае спаборніцтва па колькасьці калектывізацыі;

г) ня досыць рашуча і своячасова рэагаваў на скрыўленьні лініі партыі, што дапускаліся паасобнымі работникамі і арганізацыямі, у выніку чаго гэтыя памылкі часта паглыбляліся ізаявымі арганізацыямі;

д) ня вёў рашучай і пасьлядоўнай барацьбы з няправільнай арыентацыяй ізаявых арганізацый у справе калектывізацыі і асьвятленьня лініі партыі ў газэтах па пытаньнях калектывізацыі і пасёўнай кампаніі;

е) не асудзіў і не скасаваў пастаноў паасобных райкомаў аб правядзеньні суцэльнай калектывізацыі раёну да пачатку веснавой сяўбы (Барысаў, Вузда).

Асуджаючы ўсе вышэй адзначаныя памылкі, аб'яднаны пленум АК і АКК VI пленуме АК на калектывізацыі на асобных раёнах, па вызначэньні %%, колькасьці) з Мазыром, вызначэньні двух раёнаў су

Слова ўсесаюзнаму дастаўшчыку сілосарэзак

2.190 сілосарэзак чакае у гэтым годзе Савецкі Саюз ад гомельскага „Сельмаша“

ГАНЕБНАЕ АДСТАВАНЬНЕ Ў ПЕРШЫЯ МЕСЯЦЫ РАБОТЫ

3 замест 15 штодзенна выпускае завод

Не забудзьце, барацьба за сілос—барацьба за ўтварэньне моцнай кармовай базы ў краіне

(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Гомель сёпешняга дня — горад высокіх тэмпаў індустрыялізацыі. На ваколіцах Гомелю будуюцца такія гіганты індустрыі, як мэханізаваная гута, дрэваапрацоўчы камбінат, завод с.-г. машын, раённая дзяржаўная электрастанцыя.

Сярод буйных прамысловых будаўніцтваў БССР Гомельскаму заводу с.-г. машын належыць адно з першых месц.

ПЕРШАЯ САВЕЦКАЯ СІЛОСАРЭЗКА ВЫПУШЧАНА ГОМЕЛЬСКІМ «СЕЛЬМАШАМ»

На тэрыторыі калісьці квітнеючага фруктовага Новікаўскага саду князя Паскевіча цяпер вырас рад вялікіх карпусоў заводу с.-г. машын.

Завод будзе магутным фактарам у калектывізацыі сельскай гаспадаркі краіны. «Сельмаш» мае ўсесаюзнае значэньне. Дзесяткі тысяч складаных с.-г. машын — сілосарэзак, кускутаў, бульбасартавалак, бульбамыек, якія дагэтуль не вырабляліся у СССР і прывозіліся да нас з Амэрыкі і Нямеччыны дасьць «Сельмаш» савецкім палём. Зьберажэньні ў 850.00 руб. залатой валюты за першы год работы — такавы пэрспэктывы гомельскага «Сельмашу».

Дрэваапрацоўчы, мэханічны, загатовачны і зборачны корпусы ўжо скінулі з сябе рыштаваньні. І толькі ліцейны корпус яшчэ апранут у рыштаваньні і чакае больш хуткіх тэмпаў будаўніцтва.

37 гэктараў тэрыторыі, 25.000 кв. мэтраў агульнай плошчы вытворчых карпусоў, 7.160.000 руб.—кошт будаўніцтва—вось аб'ём работы на Гомельскім «Сельмашы»

Завод будзе мець свой чыгуначны транспарт. Штодзённы грузазварот яго—45 вагонаў машын і сырцу.

Дрэваапрацоўчы цэх расьцягнут на чвэрцку кілёмэтра. Гэта самы вялікі будынак у Беларусі. Цэх падзяляецца на рад аддзяленьняў — малярнае, сталярнае, сушыльню.

У мэханічным цэху — у гэтым цэнтральным корпусе заводу — роўнай шарэнгай стануць у рад сотні варштатаў і бормашын.

Ліцейны цэх — увесь з жалеза і бэтону рамкай каструкцыі. Разьмер яго 100 на 40 мэтраў. У ім разьмесьцяцца 4 вагранкі для выплаўкі чыгуну. Канвэерная фармоўка, адліўка чыгуну, якая будзе ўведзена ў ліцейным цэху, ужываецца на буйнейшых заводах СССР у адзіночных выпадках.

Завод мае ўжо значную колькасьць арыгіналаў чарцяжоў новых складаных і поўскладаных машын, якія ўпершыню будуць вырабляцца ў СССР. Ленінградскі «Гипромаш» узяў на сябе абавязак скончыць на працягу 2-х месяцаў перапрактаваньне «Сельмашу» на хаду з тым, каб пераключыць яго на абслугоўваньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Прадстаўнікі «Гипромаша» ўжо былі ў Гомелі і сабралі ўвесь матар'ял, патрэбны для перапрактаваньня заводу. Значная частка абсталяваньня ўжо ёсьць на месцы. Завод будуецца паводле савецкага праекту савецкімі інжынэрамі і кансультантамі.

У канцы 1930 году гомельскі «Сельмаш» — першы ў БССР завод с.-г. машын — пачне працу поўным ходам.

За савецкую сілосарэзку

«Сельмаш» у працэсе будоўлі. Але адзін з цэхаў яго — зборачны, прыстасаваны да выпуску сілосарэзак, у якіх СССР адчувае вялікую патрэбу, — пачаў ужо работу.

Зборачны цэх, у якім нараджаюцца першыя савецкія сілосарэзкі, прыцягвае да сябе ўвагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Ад тэмпу работы зборачнага цэху — першага пушчанага цэху «Сельмашу», залежыць выкананьне пляну сілаваньня ў СССР.

Гомельскі «Сельмаш» — усесаюзны дастаўшчык сілосарэзак.

Гомельскі «Сельмаш» у першы год сваёй работы павінен даць 2.190 сілосарэзак і гэтым самым пакрыць даволі значную частку патрэб саюзнага рынку ў сілосарэзках. У будучым годзе «Сельмаш» павінен даць ужо 10.000 сілосарэзак

У жніўні—верасьні сотні буйных калгасаў і саўгасаў Паўночнага Каўказу, Крыму, Далёкага Ўсходу з нецярплівасьцю будуць чакаць ад гомельскага «Сельмашу» першых савецкіх сілосарэзак для сілаваньня кармоў.

Сілаваньне кармоў — гэта балвы лёзунг надыходзячага лета. Бяз сілосаў немагчыма стварэньне буйной жывёлагадоўчай гаспадаркі. Барацьба за сілос ёсьць барацьба за стварэньне моцнай кармавой базы. Калгасы і саўгасы змогуць забясьпечыць сябе добрымі, спажыўнымі кармамі на зіму і вясну толькі шляхам шырокага ўжываньня сілаваньня кармоў.

Але нават пры выкананьні «Сельмашам» поўнасьцю сваёй праграмы, сілосарэзкі змогуць працуюць ня больш 30 проц. сілаванай масы.

Чаму „Сельмаш“ ганебна праваліў свой першы прамфінплян

Гомельскаму «Сельмашу» было дана баявое заданьне — **у красавіку даць 60 сілосарэзак, маі — 370, чэрвені—420, ліпені — 420, жніўні — 460, верасьні—460.** Заданьне яснае і катэгарычнае.

Рабочыя, інжынэрна - тэхнічны пэрсанал абавязаліся **з 10-га мая павялічыць выпуск сілосарэзак з 5-ці штук у дзень да 15.**

Што патрабуецца для выкананьня такога заданьня?

Яснае разуменьне кожным працаўніком сваіх функцый і месца ў вытворчасьці.

Строгая плянавасьць.

Узмоцнены тэмп і новыя мэтады работы.

Гэтых умоў на «Сельмашы» няма. Тое, што адбываецца зараз на «Сельмашы», можна ахарактарызаваць, як ганебны правал першага прамфінпляну. «Сельмаш» вернымі крокамі ідзе да чорнай дошкі.

З і 15 — гэтыя дзьве лічбы даюць найлепшую характарыстыку работы зборачнага цэху. **Завод ня толькі не фарсуе выпуск сілосарэзак, але цягне назад. Замест 15-ці сілосарэзак у дзень, завод пакуль што выпускае нават ня 5, а 3.**

Зразумела, што пры такім тэмпе работы ня можа быць і гутаркі аб выкананьні прамфінпляну і пляну сілаваньня кармоў. Дагэтуль завод адгрузіў толькі... 11 сілосарэзак, замест 60, якія завод павінен быў даць у красавіку. Можа няма матар'ялаў? Гэтых матар'ялаў ёсьць на 1.000 сілосарэзак.

Вытворчыя непарадкі б'юць па прамфінпляне

Усякія спасылкі кіраўнікоў «Сельмашу» на тое, што ў прарывах вінаваты толькі дапаможны завод «Рухавік Рэвалюцыі», аб'ектыўныя ўмовы, — нясур'ёзны.

На заводзе **вялікія вытворчыя непарадкі,** расхлябанасьць, якія моцна б'юць па выкананьні прамфінпляну.

Дамо слова насьценнай газэце «Сельмашу» «Сілосарэзка». Газэта піша:

«Прыцыцы адзінаначальля на заводзе не праведзен. Не ўстаноўлены дакладна правы і абавязкі майстроў. Плян не даведзен да варштату, да кожнага рабочага. Рабочы працуе ўсьляпую, ня ведаючы, што патрабуецца ад яго для выкананьня прамфінпляну. Замест баявой падрыхтоўкі да пераходу на плянавую і паточную работу, усе, пачынаючы ад вышэйшай адміністрацыі і канчаючы рабочымі, ня прымаюць патрэбных мер для ліквідацыі прарываў. Зборка сілосарэзак праходзіць бясплянава, курыльня поўна рабочых. Сьвідравальшчыкі ходзяць да токараў і просяць работы, а загадчык вытворчасьцю звальвае віну на «Рухавік Рэвалюцыі», на аб'ектыўныя ўмовы».

Такі агульны малюнак у зборачным цэху «Сельмашу».

«Сельмаш» робіць спробу цалкам зваліць віну за зрыў прамфінпляну на завод «Рухавік Рэвалюцыі», які робіць дэталі для сілосарэзак.

Але чаму-жа здарылася, што «Рухавік Рэвалюцыі», адзін з перадавых заводаў Гомельшчыны, які выканаў за першае паўгодзьдзе свой прамфінплян на 101 проц. і значна зьнізіў сабекошт прадукцыі, абвінавачваецца ў зрыве работы «Сельмашу»?

Мы азнаёміліся з гэтым пытаньнем і выявілася, што «Сельмаш», які мае значныя кадры інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу, **нічога не зрабіў, каб дапамагчы «Рухавіку Рэвалюцыі»** ў найбольш хуткі тэрмін прыстасаваць сваю работу да патрэб зборачнага цэху «Сельмашу». «Сельмаш» ня выкаў свайго абавязку на арганізацыйнай дапамозе ў рабоце «Рухавіка Рэвалюцыі», які ў **першыню пачаў рабіць дэталі да сілосарэзак.** «Рухавік Рэвалюцыі» з свайго боку таксама праявіў мала ініцыятывы і энэргіі ў хутчэйшым наладжаньні выпуску дэталяй у патрэбнай колькасьці. **Такія ўзаемаадносіны «Сельмашу» з «Рухавіком Рэвалюцыі» служаць аднэй з прычын раду вытворчых няўвязак, непасьпяваньня «Рухавіка Рэвалюцыі» за нават слабымі тэмпамі «Сельмашу».** У той-жа час «Рухавік Рэвалюцыі» на сваім абсталяваньні ў поўнай меры можа забясьпечыць нармальную работу «Сельмашу» па выпуску 15 сілосарэзак за дзень. Увязаць работу «Сельмашу» і «Рухавіка Рэвалюцыі»— неадкладная задача, якую гэтыя прадпрыемствы па аб'яднаных вытворчых нарадах абяцалі выканаць.

Сам «Сельмаш» са спазьненьнем на паўтара месяцы прыступіў да зборкі сілосарэзак.

Зборачны цэх фактычна закіданы сілосарэзкамі. Іх 150 штук, але ўсе яны без ланцугоў і калёс і ня могуць быць пушчаны ў работу. Замест таго, каб своячасова паладзіць выпуск ланцугоў для сілосарэзак у Беларусі, «Сельмаш» даў заказ маскоўскаму заводу «Фитинг» на 50 камплектаў ланцугоў. Заказ гэты ня выканан, і цяпер «Сельмаш» робіць ланцугі ў сябе на заводзе. «Сельмаш» ня прыняў належных мер, каб прымусіць завод «Пралетары» выканаць заданьне — 600 калёс у месяц. «Пралетары» здаў толькі 350 калёс.

Пра кадры для заводу забыліся

У зборачным цэху на рабоце занята 280 чалавек. Гэтыя рабочыя ў значнай сваёй частцы, з прычыны нізкай кваліфікацыі, нагружаны на 50 проц. Не хапае кваліфікаваных рабочых — токараў, сьвідравальшчыкаў.

Пытаньне аб кадрах для «Сельмашу» своячасова ня было прапрацавана. Белмэталяб'яднаньне, саюз мэталістых не прынялі мер для стварэньня ў Беларусі магутнага фабзавучу мэталістых. **І толькі зараз, калі выявілася катастрофа з кваліфікаванымі кадрамі, вызначылі 700.000 руб. на адкрыцьцё на заводзе фабзавучу.**

Нязгунасьць на «Сельмашы» некваліфікаваных рабочых адбіваецца на якасьці прадукцыі. На прэсе, які ёсьць на заводзе, можна вырабляць у патрэбнай колькасьці ланцугі для сілосарэзак. Але прасавальшчык — мала кваліфікаваны работнік. Зробленыя штампы нікуды ня вартыя, кольцы ланцугоў затрымліваюцца ў прэсе і іх прыходзіцца выбіваць зубілам. Ёсьць ня мала сілосарэзак, дзе гайкі ня досыць замацаваны.

На завод паступілі новыя замежныя машыны, з якімі рабочыя мала знаёмы. Трэба было раней праінструктаваць рабочых. Гэтага ня было зроблена. У выніку неспрактыкаванасьці рабочага ледзь не загінула новая замежная машына.

Адміністрацыя і майстры застаюцца глухімі да прапаноў рабочых аб удасканаленьні зборкі сілосарэзак. Так, напрыклад, не рэалізавана прапанова рабочых аб вырабе прыстасаваньняў да апрацоўкі вілкі шарніру і 50 проц. вілак дагэтуль выходзіць у брак.

Трыкутнік «Сельмашу» не паставіў у цэнтры сваёй работы барацьбы за прамфінплян. Сацспаборніцтва, ударны рух толькі цяпер разгортваюцца. Самакрытыка адсутнічае. Новы заўком мэталістых не стварыў вакол сябе моцнага ядра добраахвотнікаў. Між тым, на заводзе ёсьць глеба для масавай работы. На «Сельмашы» працуе значны кадр старых кваліфікаваных рабочых з заводу «Рухавік Рэвалюцыі».

На «Сельмашы» каля 40 камсамольцаў. Гэтыя камсамольцы не зьяўляюцца прыкладам на вытворчасьці. Ёсьць выпадкі недысцыплінаванасьці з боку маладых рабочых, манкіраваньня і г. д. Камсамольцы на заводзе не зьяўляюцца пачынальнікамі сацспаборніцтва.

ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ ГОМЕЛЬСКАГА «СЕЛЬМАШУ»

***

На гомельскі «Сельмаш» ускладзена адказнейшая задача — даць у гэтым годзе Савецкаму Саюзу 2.190 сілосарэзак. Дабіцца выкананьня прамфінпляну — баявая задача. Рабочыя заяўляюць, што выканаць прамфінплян можна.

«Сельмаш», усе яго заводзкія арганізацыі, павінны безадкладна перабудаваць сваю работу. «Сельмаш» павінен стаць сапраўдным сацыялістычным прадпрыемствам. У гэтай справе «Сельмашу» патрэбна дапамога з боку ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый.

МІХ. КІН.

Вайна стратам!

„Тысяча рублёў—ня грошы“

Арыгінальны мэтад прэміяваньня на бровары „Беларусь“

Па заводах харчовай прамысловасьці амаль ніякай барацьбы са стратамі пара - электраэнэргіі не вядзецца. Яскравым прыкладам можа быць дражджавы завод «Пралетары».

У сэпаратным аддзяленьні вокны пакрыты такім таўстым пластом пылу, што праменьні сонца ніяк ня могуць прабіцца. Вокны ніколі ня мыюцца, апрача таго яны завалены розным хламам. Таму рабочыя прымушаны цэлыя суткі паліць 4 лямпкі па 50 сьвечак.

Ящчэ горш на складзе гатовай прадукцыі. Тут ноччу і днём гараць 6 лямпак, гараць нават тады, калі на складзе нікога няма.

Адсутнасьць барацьбы са стратамі прыводзіць да перавыдаткаваньня аналу і энэргіі. Прамфінплянам прадугледжана выдаткаваньне аналу на 66 руб. 44 кап. на тону дражджаў, а фактычна выдаткавана 67 руб. 94 кап. Гэта за паўгодзьдзе складае перавыдатак у **910 р. 80 кап.** Але ў заводакіраўніцтве лічаць такі перавыдатак «драбніцай».— «Чапуха» — гаворыць бухгальтар тав. Вайнтраум, — ці варта гаварыць аб такой страце?».

Ня лепшая справа і на бровары «Беларусь». Тут можна эканоміць на выдаткаваньні аналу як пры апальваньні каравога катла, так і пры апальваньні печаў для сушкі соладу і варкі піва. Але ўліку выдаткаваньня аналу на бровары няма. Эканомія вылічваецца «на вока». Таму на бровары кажуць, што на сушку соладу і варку піва перавыдаткавана аналу на 25 проц.

— А колькі перавыдаткавана на апальваньне катла?

— Тут перавыдатку ня будзе, — упэўнена кажуць адміністратары.

Але тут ніякага ўліку выдаткаваньня аналу няма. А пакуль што, як гэта лічыць, качагары атрымліваюць **аванасы пад прэміі.** Кожны месяц качагары атрымліваюць каля 30-35 руб. у кошт **будучай эканоміі.**

— А калі будзе падлічана эканомія?

— Пасьля таго, як спалім увесь вугаль і дровы, — адказваюць адміністратары, — тады і нормы выдаткаваньня аналу вызначым.

Зразумела, з такой пастаноўкай уліку аналу трудна дабіцца якое-небудзь эканоміі. У прыватнасьці, на бровары «Беларусь» да гэтага часу не скарыстоўваецца адыходная пара, якую можна скарыстаць для паркі начыньня.

Прафарганізацыі не папулярызавалі пастаноў партыі і ўраду аб жорсткай эканоміі пары і энэргіі. Асабліва гэта адчуваецца на прадпрыемствах харчовай прамысловасьці.

А. М.

Ці даведзен прамфінплян да рабочых?

Усесаюзная праверка выкананьня заданьняў ВСНГ і УсеЦСПС

Усім рэспубліканскім, абласным, краёвым і акруговым КК РСІ

Усім фабрычна—заводзкім атрадам „Лёгкай кавалерыі“

ЦКК-РСІ, УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ арганізуюць адначасовы ўсесаюзны налёт «лёгкай кавалерыі» на прадпрыемствы па праверцы выкананьня заданьняў ВСНГ і УсеЦСПС аб давядзеньні прамфінпляну да цэху, брыгады, агрэгату і паасобнага рабочага.

Налёт адбудзецца **23,24 і 25 мая** атрадамі «лёгкай кавалерыі», з удзелам **ударнікаў, рацыяналізатараў і самаправерачных брыгад.** Гэту работу правесьці разам з арганізаванымі **ЧКК па самаправерцы.**

ТРЭБА ПРАВЕРЫЦЬ:

Ці маюць цэхі прамфінпляны, у якіх цэхах і па якіх прычынах іх няма.

Ці даны вытворчыя заданьні і паказчыкі брыгадам, агрэгатам і варштатам у паасобных зьменах і па які пэрыяд (месяц, дэкаду, пяціднёўку, дзень).

Ці арганізаваны ўлік работы цэху, брыгады, агрэгатаў і варштатаў, па якіх пэрыядах і паказчыках вядзецца ўлік.

Як арганізавана інфармацыя рабочых аб выніках работы (намесячна, падэкадна і г. д.).

Як прыцягнуты рабочыя да раскладкі прамфінпляну на цэхах і ўнутры цэху.

Высьветліць разам з рабочымі **прычыны і канкрэтных вінаватых** у невыкананьні дырэктыў ВСНГ і УсеЦСПС аб давядзеньні прамфінпляну, паставіць пытаньне перад органамі РСІ **аб прыцягненьні іх да адказнасьці.**

Зводныя весткі аб выніках работы выслаць да УсеЦСПС **да 1 чэрвеня.**

ЦКК-РСІ—САЙКІН.

УсеЦСПС—СЭГАЛ

ЦК УсеЛКСМ—ДЖАВАХІДЗЭ.

Ударыць па недаацэнцы важнейшага пытаньня

Давесьці прамфінплян да кожнага рабочага!

Самаправерка выкананьня прамфінпляну, сацдагавораў і ўдарніцтва выразна паказвае, што асноўнае мерапрыемства, якое павінна дапамагчы выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну — **давядзеньне прамфінпляну да кожнага цэху, варштату і кожнага рабочага** — не ажыцьцяўляецца. Гэта датычыць **большасьці** прадпрыемстваў беларускай прамысловасьці. І ў гэтым — пагроза недавыкананьня гадавога прамфінпляну, тым больш, што на асобных прадпрыемствах, **амаль выключна з прычыны недавядзеньня прамфінпляну да кожнага рабочага,** ёсьць вялікія прарывы.

Як адносяцца адміністратары да гэтай важнейшай справы? Звычайна адміністрацыя абмяжоўваецца адным ці двума дакладамі на агульных сходах рабочых аб агульных лічбах прамфінпляну. Такія даклады, зразумела, патрэбны, але абмяжоўвацца толькі імі ніякім чынам нельга. Што датычыць давядзеньня прамфінпляну да кожнага рабочага, або да кожнай брыгады, то вельмі рэдка, дзе гэта праведзена. Можна паказаць толькі 2-3 такіх прадпрыемствы (гута «Пралетары», швэйная фабрыка «Кастрычнік»), дзе ў гэтым кірунку праведзена канкрэтная работа.

Затое ёсьць шмат прадпрыемстваў, дзе адміністрацыя або ня ведае, як давесьці прамфінплян да кожнага рабочага, або **не даацэньвае гэтага важнейшага пытаньня.**

Вось на буйнейшым нашым прадпрыемстве — машына-будаўнічым заводзе **«Чырвоны Мэталісты»,** дзе ў пачатку бягучага гаспадарчага году мелі месца буйнейшыя прарывы і які **зараз яшчэ не ліквідаваў прарывы першага паўгодзьдзя,** прамфінплян для многіх рабочых зьяўляецца «кітайскай граматай». Тое-ж самае на буйным заводзе **«Энэргія»,** дзе вельмі нясьмела робіцца «спроба» давесьці прамфінплян да аднаго толькі цэху. Гэта марудзьнасьць выклікана галоўным чынам шкоднай «устаноўкай» дырэктара т. **Атрошка,** які лічыў, што «прамфінплян да кожнага рабочага можна давесьці толькі тэарэтычна, а не практычна».

На гарбарні **«Бальшавік»,** на якім таксама ня ўсё добра з выкананьнем якасных паказальнікаў прамфінпляну, апошні да рабочага не даведзен. Адміністрацыя да сёпешняга дня ня выканала пастановы канфэрэнцыі ўдарнікаў, якая адбылася ў сакавіку, аб давядзеньні вытворчых плянаў да кожнага варштату.

Зусім правільна адзначыў тады на канфэрэнцыі рабочы заводу т. Каган, што калі-б рабочаму на другі дзень паказалі бракаваную прадукцыю, якую ён учора зрабіў, ды запісалі-б дзе-небудзь на дошцы — «для памяці», — гэта значна дапамагло-б зьніжэньню браку.

На менскай абутковай фабрыцы дырэктар т. **Шэрман** і старшыня фабкому т. **Звонак** былі упэўнены, што кожны рабочы фабрыкі добра ведае свой прамфінплян. Але аказалася, што рабочыя ведаюць толькі свае нормы выпрацоўкі, але ня ведаюць, якое месца гэта норма займае ў агульным выкананьні прамфінпляну.

А дырэктар шчотачнай фабрыкі тав. **Наждан** лічыць амаль немагчымым давядзеньне пляну да рабочых ва ўмовах работы фабрыкі. Між тым, даволі было-б крыху падумаць над гэтым пытаньнем, як усе «труднасьці» зьніклі-б самі сабою.

Такія-ж весткі аб недавядзеньні прамфінпляну да варштатаў і рабочых ідуць з многіх іншых прадпрыемстваў (лесазавод «Калектыўная Праца» ў Нова-Беліцы, завод імя Ландыцкага ў Гомелі і т. д.).

Трэба сказаць, што **самаправерка выкананьня сацдагавораў значна падштурхнула заводакіраўніцтвы і прафарганізацыі.** Ёсьць ужо рад фактаў, якія сьведчаць аб некаторых пераломе ў гэтай справе. Напрыклад, **на гуце імя Домбаля пры дапамозе самаправерачнай брыгады** распрацаваны практычны плян давядзеньня вытворчых заданьняў да кожнага рабочага. Можна сказаць з упэўненасьцю, што **давядзеньне работ** чых а прамфінпляну ў такім парадку, як гэта выканала самаправерачная брыгада, дасьць магчымасьць ня толькі выканаць прамфінплян, але і перавыканаць.

Больш зацікавілі гэтым пытаньнем і на радзе іншых прадпрыемстваў («Чырвоная Бярэзіна», «Энэргія», «Камунар» і інш.).

Але **сёпешнія тэмпы давядзеньня** прамфінпляну да кожнага рабочага **далёка невыстарчальны.** Канчаецца другая дэкада **восьмага месяца** бягучага гаспадарчага году. Да канца гаспадарчага году засталося **вельмі мала часу.** Прадпрыемствы, якія маюць прарывы ў выкананьні прамфінпляну, павінны сьпяшацца з ажыцьцяўленьнем важнейшага мерапрыемства, якое павінна дапамагчы ліквідаваць прарывы — **з ажыцьцяўленьнем дырэктывы партыі аб давядзеньні прамфінпляну да кожнага рабочага месца.**

Арганізаваны налёт (гл. вышэй адозву ЦКК-РСІ, УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ) на прадпрыемствы для праверкі давядзеньня прамфінпляну да кожнага рабочага месца павінен зрабіць карэнны пералом у гэтай справе.

П.

Аб аднэй „спробе аўтабіяграфіі“*)

Калі Троцкі зноў узяўся за стварэньне сваёй фракцыі? Наўрад ці гэта мела месца зараз-жа пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі: у гэтыя дні ён настойліва адчуваў сябе зноў «першым вучнем», хаця і не на такой вялікай адлегласьці ад другога, як у рэальнай школе св. Паўла, што «ўласная фракцыя наўрад ці практычна прадстаўлялася яму патрэбнай. Ён ужо мысьліў сябе на часу сусьветнай рэвалюцыі, а сама гэта рэвалюцыя мысьлілася ім, як зараз убачым, справаю заўтрашняга дня. Навошта тут фракцыя? Фракцыі стварае той, хто адчувае сябе слабым—Троцкі у гэтыя мінуты адчуваў сябе мацнейшым за ўсіх.

А потым здарыўся аглушаючы ўдар берасьцейскай катастрофы—для Троцкага гэта была іменна катастрофа. Катастрофа, ён ня мог гэтага не разумець—ня будучы геніям, Троцкі ўсё-ж і ня тупіца,—выкліканая на тры чвэрці яго лёгкадумнасьцю. Лёгкадумна надыйсьці да такой адказнейшай функцыі, як кіраўніцтва замежнай палітыкай першае сацыялістычнае дзяржавы на сьвеце, было нельга. Адзін узорык гэтае лёгкадумнасьці захаваў сам Троцкі. Цытуючы чысьцці ўспаміны, ён перадае—не спрачаючыся—такую сваю фразу: «Якая-такая ў нас будзе дыплёматычная работа? Вось выйдзе некалькі рэвалюцыйных пракляманцый да народаў і зачыню крамку» (т. II, 64).

Мая памяць падказвае мне другі узорык—яшчэ больш жудасны, паколькі тут справа страшэнна блізка была да непасрэдных практычных вываладаў. Даганяючы нашу мірную дэлегацыю (прадстаўляючы сабою працяг перамір'ю, яна ўся была ўжо ў Берасьцю), яна зьявіўся ў Смольны за інструкцыямі. Ніякіх інструкцый я не атрымаў, але замест іх пачуў наступны анэкдот, расказаны мне з поўнай верай у праўдзівасьць здарэньня. На нямецкім усходнім фронце паўстаньне; трыццаць тысяч паўстаўшых салдат умацаваліся несьці паўстаўшых салдат умацаваліся недзе паміж Коўнай і Горадняй, некалькі дывізій зьнята з фронту для іх уціхамірваньня.

Анэкдот аказаўся літаральна «выхапленым з паветра», як кажуць немцы, абсалютна нічога падобнага на нямецкім фронце тады не адбывалася. Але для «умопастроенія» майго «собеседника» ён надзвычай характэрны. Троцкі вён надзвычай характэрны. Троцкі вёў рыў ня толькі ў блізкасьць эўрапэйскай рэвалюцыі,—ён верыў, што яна адбудзецца літаральна на другі дзень. Пры такіх умовах якая-ж дыплёматыя ў сапраўдным сэнсе? Кампрамэтаваць сябе перад нямецкага пралетарыяту «всамвачыма нямецкага пралетарыяту «всамделишними» перагаворамі з урадам, якога пасьлязаўтра ўжо ня будзе. Ясна, што трэба было як-небудзь працягнуць некалькі дзён—і потым ужо гаварыць з старшынёй нямецкага СНК Карлам Лібкнэхтам.

Што гэты, амаль ужо зьвергнуты ўрад праіснуе даволі доўга, каб панесьці нам праіснуе даволі доўга, каб нанесьці нам жорсткі ўдар, што адцягваць трэба гэты ўдар, а не пачатак сур'ёзных перагавораў з немцамі, што для гэтага іменна патрэбна было павесьці сур'ёзнае дыплёматычнае змаганьне, карыстаючыся спрэчкамі ў стане працаўніка, правесьці гэтак-жа сама дакладна, як вядуць ваенныя апэрацыі,—усё гэта Троцкаму ня прыходзіла ў галаву. Ён наіўна меркаваў, што варта толькі перанесьці цыцырк Мадэрн у Берасьце—і справа будзе скончана. Што з гэтых берасьцейскіх прамоў да нямецкага рабочага дойдзе толькі тое, што дазволіць надрукаваць ваенная цэнзура Вільгэльма II, гэта высьлізнула з яго галавы.

І побач з гэтай да крайнасьці перавялічанай верай у магутнасьць свайго слова—да трусасьці даходзячая слабасьць перад сваім рэальным працаўнікам, з якім мы стаялі нос у нос. Пасьля разрыву перагавораў у сьнежні вырашана было, што мы ні ў якім выпадку ня вернемся ў Берасьце—далейшыя перагаворы будуць весьціся толькі на нэйтральнай тэрыторыі (на мячаўся Стакгольм), або «на дроце», у бараку паміж двума фронтамі. Трэба прачытаць успаміны Чэрніна, каб зразумець да чаго ў нямецкім лягеры баяліся, што мы ня пойдзем зноў у берасьцейскую пастку. У існасьці справа ішла аб дэманстрацыі таго, каму мір патрэбен у даную мінуту. Згадзіўшыся на Берасьце, мы тым самым канчаткова ўкаранілі ў сьвядомасьць дыплёматаў цэнтральных дзяржаў перакананьне, што савецкая ўлада хоча міру як-бы там ні было,—гэтыя дыплёматы атрымалі над намі такую псыхалёгічную перавагу, якое не маглі ўроўнаважыць ніякія аратарскія посьпехі Троцкага. Мы ехалі —другі раз у Берасьце ўжо капітулявацца, але не фармальна,—што пазбаўляла нас усякіх выгад капітуляцыі, бо дазваляла працаўніку і далей разглядаць нас, як паўючы край.

Тлумачэньне гэтай капітуляцыі да бойкі я не атрымаў тады — і не атрымаў цяпер, прачытаўшы адпаведны разьдзел «Спробы аўтабіяграфіі». «Нам прышлося схіліцца перад ультыматумам і застацца ў Берасьці»—вось усё, што можна прачытаць аб гэтым у мэмуарах галавы савецкай дэлегацыі. Чаму? Калі трэба было схіляцца перад усякім ультыматумам немцаў, дзеля чаго быў адкінут ультыматум 10-га лютага? Рызыкі ў першым выпадку было менш, бо ў руках у Кюльмана і Гофмана ня было яшчэ дагавору з Украінскай радай, хаця і вельмі недасканалага, але ўсё-ж сродку даручыць нямецкія народныя масы і цягнуць за сабою на поўдзень Аўстрыю. Лёгкі тут ніякай знайсьці нельга, калі нават стаяць на пункце гледжаньня неадкладнага атрыманьня якога-б там ні было міру, усё-ж ня было ні наймешнага рэзону крычаць аб гэтым са стрэхаў і выдаваць сябе галавою працаўніку. Але на гэтым пункце гледжаньня ніхто не стаяў,—Ленін быў за перагаворы «на дроце». На міры ён налягаў толькі ў выпадку прад'яўленьня немцамі ультыматуму іменна аб міры, а не аб месцы перагавораў.

Лёгку тут цяжка знайсьці. Але затое псыхалёгічнае тлумачэньне знайсьці лягчэй лёгкага. На наступнай-жа старонцы мы чытаем аб жыцьці дэлегацыі ў Берасьці ў часе перагавораў:

«Наўкола будыцкаў штабу ішла ў розных кірунках высокая агароджа з калючага дроту. У часе ранішняй пагулянкі я натыкаўся на надпісы: «Захвачаны тут рускі будзе расстраляны». Гэта адносілася да палонных. Я пытаў сябе, ці адносіцца надпіс таксама і да мяне—мы былі нападлому ў палоне—і варочаўся назад» (т. II, 94).

Вось у тым і справа, што Троцкі, убачыўшы першую рэальную, ці якая здалася яму рэальнай, перашкоду, заражжа «варочае назад». Пішучы гэтыя радкі ў гэтыя самыя дні абхадзіў наўкола берасьцейскай цытадэлі дзесяткі кілёмэтраў, ні разу не падпаўшы большай нянрыемнасьці, чым неабходнасьці паказаць пропуск нямецкім вартавым! Я гаварыў з рускімі палоннымі,—прычым вартаваўшыя іх немцы адносіліся да гэтага з найвялікшай дабрадушнасьцю, турботна папярэджваючы мяне і асоб, што са мною гаварылі, калі на краявідзе паказваўся афіцэр,—я поўтадзінамі назіраў, як нямецкія навабранцы практыкуюцца з ручнымі гранатамі і г. д., і г. д. Ня так ужо чорт страшны, як яго малюе напалоханае выбражэньне. А выбражэньне будучага галавы сусьветнай рэвалюцыі было моцна напалохана—гэта выразна адбілася ў адным іншым ўражаньне жорсткага правалу. Адсюль поўная адсутнасьць усякіх фантазій—і ультра-дзелавы, каб не сказаць дзяляцкі, падыход да новай работы, якую даў яму Ленін, фармаваньня Чырвонай арміі. У Берасьці, здавалася, непатрэбны якія-б там ні было спэцыялістыя—цяпер у адным спэцыялістых быў увесь ратунак. «Адтэрміноваўня тут, паводле агульнага правіла, не давалася. Памылкі цягнулі за сабой неадкладную кару» (там-жа, 168). Так малое Троцкі абстаноўку сваёй новай справы: але хіба толькі што ня было дана самага перакананьня даводу, што да дыплёматаў гэта прыстасоўна якраз столькі-ж, колькі і да вайны?

І толькі калі вайна пачала напраўляць рэпутацыю, у корань сапсаваную дыплёматыяй, Троцкі пачынае ўспаміваць старое. Але цяпер ужо «правадыр» ня мог разьлічваць на аднаго сябе. Трэба было зьбіваць «групку». Першы намёк на ўзьнікненьне трацкісцкай фракцыі адносіцца, відавочна, да канца 1919 году—храналёгія «Аўтабіяграфіі» тут вельмі ня выразная. Што намёк гэты ахінуты ў форму, пібыта, «извета» тав. Сталіна,—якога пібыта «выдаў» тав. Мяжыньскі.—не павінна нас турбаваць. (т. II, 181-184). Надта ўжо шляхетнае абурэньне, з якім Троцкі сустрэў (такое нявіннае дзіця, падумаеш!) вестку, што супроць яго вядзецца «інтрыга» і западта занепакоіўся для такой нявіннасьці. І праз меру пасьпяшыўся правярыць непасрэдна ў Леніна. —што іменна той ведае? Але «правярыць» у Леніна, відавочна, не ўдалося —Троцкі толькі «зразумеў», што «Мяньаб фракцыі, якая завязалася, сёе-тое пранікла далей, чым трэба было.

Поўным ходам ішла фракцыйная работа пад зіму 1920-21 г.—да часу вядомай спрэчкі аб прафсаюзах. Спрэчка гэта ўсяляк паказваецца, як пазбаўленая «ўсякага значэньня». Аб ня менш, чым спрэчка, аб выдатным маноўры Троцкага,—які з прыхільнікаў «адзяржаўленьня» прафсаюзаў амаль у момант абярнуўся ў прыхільніка дыямэтральна процілеглай, але адналькава антыленінскай пазыцыі Бухарына-Дзяржынскага —«Моя жизнь», вядома, не заікнулася ні адным гукам. Але аб фракцыйнай рабоце ў гэты пэрыяд умаўчаць ужо было немагчыма.

«Я ящчэ ў часе зьезду (X) ліквідаваў якія-б там ні было нарады з аднадумцамі ў прафесыянальным пытаньні. Праз некалькі тыдняў пасьля зьезду Ленін перакананўся, што я ня менш за яго заклапочаны тым, каб ліквідаваць часовыя групоўкі, пад якімі ўжо не заставалася ніякай прынцыповай базы». (Там-жа, 202).

Што «прынцыповай базы» ня было, гэта, вядома, правільна, але што грусам Троцкі, а што яны ў гэты час ужо пераставалі існаваць, гэтаму не паверыць маленькія дзеці—іменна з гэтага моманту «групоўкі» з «часовых» абарачваюцца ў пастаянныя.

Адмаўляць гэта можна зноў такі толькі перад «невукамі

Да пуску каналізацыі ў Менску

Па Савецкай Беларусі

Галавацяпы з „Белрыбы"

Полацкая акруга багата водазборамі і рыбай, дзе плян улову рыбы на гэты год у ліку 9.450 цэнтнэраў па акрузе *можа быць* выкананы пры наяўнасьці *на сёньняшні* дзень 7 самастойных рыбарцеляй і 9 калгасных рыбацкіх брыгад, а таксама пры наладжаньні збору і закупкі рыбы ад адзінкавых рыбакоў. Але тая праца, якая праводзіцца ў акрузе работнікамі Белрыбы, толькі тармозіць выкананьне пляну.

Амаль пры кожнай рыбацкай арцелі і рыбацкай брыгадзе пры калгасах ёсьць спэцыяльныя платныя прадстаўнікі ад рыбгаспадарак. Але гэтыя работнікі на прымаюць непасрэднага ўдзелу ў працы на ўлове рыбы і не вядуць барацьбу з дранежніцкай лоўляй. Каб здаць злоўленую рыбу гэтаму прадпаўніку, членам арцелі прыходзіцца іх шукаць, адрываючыся ад непасрэднай работы. Арцелі *бачаць* гэтых прадстаўнікоў раз або два на тыдзень (Нешчадрынская арцель).

Дастаўка рыбы не наладжана. Часта злоўленая рыба ляжыць па два дні з прычыны адсутнасьці фурманак, і гэта ў летні час, калі рыба хутка псуецца.

У Бярозаўскай рыбалоўнай арцелі прадстаўнік ад рыбгаспадаркі дагавараўся з сялянамі па дастаўку рыбы па 40 к. за пуд, а загадчык гэтай-жа гаспадаркі запланіў па 35 кап., і цяпер гэтаму прадстаўніку ніхто ня верыць. Да таго-ж сама выплата зацягваецца.

У Гомельскай рыбаарцелі, у вёсцы Туржэц, праводзіцца агульны сход рыбакоў, а загадчык рыбагаспадаркі **Самусёнак**, на тэрыторыі якога існуе гэта арцель, знаходзячыся ў Гомелі, у адным кілёматры ад вёскі Туржэц, на сход ня прыйшоў, а прыслаў бюракратычную запіску: «Праўленьню арцелі безадкладна прыбыць для перагавораў». Рыбакі на запытаньне, ці бачылі яны загадчыка адказалі, што яны яго ня бачылі — гэта ня гледзячы на тое, што Самусёнак працуе ў гэтай гаспадарцы ўжо два гады.

У акрузе цэлы рад водазбораў засьмечаны, і лавіць там рыбу немагчыма. Праўда, ёсьць пастанова Белрыбы аб ачыстцы гэтых водазбораў, але-ж Белрыба да гэтага часу палец аб палец ня стукнула, каб ажыцьцявіць гэту пастанову.

У далейшым неабходна прыняць тэрміновыя меры па ажыцьцяўленьні гэтых галавацяпскіх і бюракратычных зьяўішч.

РЫБАК.

Сацспаборніцтва на паперы

На Аршанскім чыгуначным вузле

На Аршанскім чыгуначным вузле не выдадзена дакладнага ўліку работы па сацспаборніцтве. На некаторых службах значна зьменшылася працоўная дысцыпліна. Ёсьць выпадкі, калі на паравозе засынае і яны машыністы і цягнік спыняецца ў дарозе.

На чыгунцы часта па некалькі сутак прастойвалі вагоны з пасеўнымі грузамі. Плугі з палпэфнага раёну, якія былі дастаўлены на чыгунку для рамонту, трапілі не ў дэпо, а на склады. Потым іх прышлося дастаўляць на падводах у дэпо.

Несвоечасовая падача паравозаў таксама павялічвалася ад 6 да 15 выпадкаў. За пазьбаньні адносіны да сваіх абавязкаў накладзены адміністрацыйныя спагнаньні на 26 чалавек, на службе пуці былі 33 прагулы і звольнена 9 чал.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што сацспаборніцтва і ўдарніцтва на Аршанскім вузле застаецца на паперы. Кіраўніцтва сацспаборніцтвам паставлена дрэнна. Сярод некаторай часткі адсталых рабочых выяўляецца рвацтва. Былі выпадкі, калі паасобныя рабочыя патрабавалі сабе ўзнагароду за тую працу, якую прыходзілася перарабляць нанава.

Прафарганізацыі таксама ня цікавяцца гэтым пытаньнем. Прамфінплян не даведзены да варштату і да кожнага рабочага паасобку.

А. М

Да будаўніцтва не падрыхтаваліся

(ГОР. ЛЕПЕЛЬ)

Рабочыя брыгады, якія абсьледвалі будаўнічыя работы ў Лепелі, выявілі поўную [illegible] ёсьць лепельскіх гаспадарчых арганізацый у падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону. У раёне вызначана для будаўніцтва 12 аб'ектаў, але да гэтага часу няма рабочых чарцяжоў і каштарысаў. Зусім няма дахавага жалеза і сгаковых вырабаў. Лесаматар'ялу загатоўлена толькі на 60 проц. Заўчыма на рабочую сілу яшчэ ня зроблена.

Нічога не робіцца ў сэнсе зьніжэньня сабекошту будаўніцтва. Культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых будаўніцтва настаўлена вельмі дрэнна. Мясцовая каапэрацыя зусім не падрыхтавалася для забесьпячэньня рабочых прадуктамі харчаваньня.

РВК, на які ўскладзены нагляд за будаўніцтвам у раёне, ня прымае ніякіх мер для ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых непармальнасьцей.

ЛЫСЫ.

Чаму зрываецца пабудова элеватару ў Воршы

ВОРША. (Наш кар.). Сёлета Саюзхлеб прыступіў да пабудовы ў Воршы элеватару на 400.000 пуд. хлеба і складаў з такой-жа ёмістасьцю. Пабудову элеватару ўзяў на сабе Хлебабуд з такім разьлікам, каб яна была скончана да 1-га кастрычніка г. г.

Аднак, Хлебабуд да гэтага часу не распачаў нават асноўных работ. Мэталятрэст пе даставіў дагэтуль для будаўніцтва патрэбнае колькасьці жалеза. Для пабудовы элеватара патрэбна 6.000 бочак цэменту, якія таксама яшчэ ня прыбылі з Менску.

Ня гледзячы на тое, што пабудова элеватару мае ўдарны характар, аршанская біржа працы адмаўляецца забясьпечыць гэта будаўніцтва рабочай сілай у першую чаргу.

Ствараецца пагроза, што пабудова яго ня будзе скончана ў тэрмін.

РАБОЧЫ ТЭАТР імя ЦСПСБ
17 мая ў памяшканьні новага клюбу Харчавікоў
адбудзецца
грамадзкі агляд п'есы СТРЭЛ—Базыменскага
пастаноўка Галоўчынера.
Білеты разасланы па союзах для прадпрыемстваў
Пачатак роўна а 7 з пал. гадз. Дырэктар тэатру Адлер.

МЕНСК

Пачынаецца справаздачная кампанія Менгарсавету

Усім дэпутатам Менгарсавету разданы друкаваныя справаздачы, паводле якіх яны будуць рабіць справаздачы перад сваімі выбаршчыкамі на прадпрыемствах.

Мандатная камісія гарсавету скончыла праверку дзейнасьці членаў гарсавету. З 141 дэпутата, якія не наведваюць пасяджаньняў, 75 чалавек выбылі на работу ў калгасы, сельсаветы і інш., а рэшта проста ня прымалі ўдзелу ў рабоце гарсавету.

Мандатная камісія запрапанавала дабраць новых дэпутатаў замест выбыўшых і паставіць пытаньне перад выбаршчыкамі аб тых 62 дэпутатах, якія прымалі слабы ўдзел у рабоце гарсавету.

Рабочыя пратэстуюць, а гарсавет маўчыць

Ня гледзячы на цэлы рад пратэстаў рабочых фабрыкі імя Крупскай, асэнізацыйны абоз кожную ноч вылівае ў раёне гэтай фабрыкі розны бруд і настолькі атручвае паветра, што рабочым няма ніякай магчымасьці весьці нармальна сваю работу. Смуродам пясе на ўвесь раён фабрыкі. Да фабрыкі не закрыйшы носа цяжка падыйсьці.

Адміністрацыя фабрыкі і фабком некалькі разоў паведамлялі аб гэтым гарсавет і прасілі, каб апошні забараніў звальваць усякі бруд у раёне фарбыкі. Гарсавет чамусьці да гэтага часу ня прымае ніякіх мер і ўсё застаецца нарэшце.

Выстаўка друку

Габінэт журналістыкі пры Камвузе наладзіў выстаўку друку, якая заключае ў сябе звыш 2.000 экспанатаў. Выстаўка разьбіваецца на цэлы рад аддзелаў; галоўнымі з якіх зьяўляюцца: аддзел дарэвалюцыйнага падпольнага друку, бальшавіцкі друк 1917-1922 год, гісторыя «Правды» — орган УсеКП(б) і гісторыя «Зьвязды» — орган ЦК КП(б)Б.

На выстаўцы прадстаўлен друк СССР на 1930 год, юнацкі друк, замежны рэвалюцыйны легальны, і нелегальны, замежны фабрычна - заводзкі. Прадстаўлен таксама аддзел «У ціскох фашысцкай цэнзуры», аддзел МОПР'у, аддзел міжнароднай рабочай сувязі і цэлы рад іншых аддзелаў.

Выстаўка зьмяшчаецца ў памяшканьні Камвузу па Унівэрсытэцкай вуліцы і адкрыта для наведвальнікаў кожны дзень ад 4 да 10 гадзін увечары.

Наведваньне праводзіцца як экскурсіямі, так і індывідуальнае. Для экскурсантаў вызначаюцца кансультанты.

ЛІКВІДАЦЫЯ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ СЯРОД 8.000 СЭЗОНЬНІКАЎ

Саюз будаўнікоў заключыў дагавары з саюзамі мэдсанпрацы, саўгандальспужачых і працмастацтва на ліквідацыю няпісьменнасьці сярод васьмі тысяч няпісьменных і малапісьменных сэзоньнікаў. На ўсіх буйных пабудовах арганізуюцца ліквпункты.

У Менску на ліквпунктах ужо навучаюцца каля 600 сэзоньнікаў. Рабачкомы рад вытворчых саюзаў прымаюць шэфства над рабачкомамі будаўнікоў у сэнсе культурнага абслугоўваньня будаўнічых рабочых.

ПАШЫРЭНЬНЕ ДРЭВААПРАЦОЎЧАЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

У Беларусі значна пашыраецца дрэваапрацоўчая прамысловасьць. У 1930-31 годзе на пабудову ў Беларусі новых дрэваапрацоўчых заводаў і рэканструкцыю старых асыгнуецца каля 4 з паловай мільёнаў рублёў.

АКРУГОВАЯ НАРАДА АГРАНОМАЎ І ЗООТАЭХНІКАЎ

Учора ў Менску адкрылася акруговая нарада аграномаў і зоатэхнікаў, на якой пастаўлены пытаньні аб арганізацыі прамысловых сьвінагадоўчых гаспадарак, аб сіласаваньні кармоў і арганізацыі малочна-жывёлагадоўчых гаспадарак. Апрача таго нарада заслухае даклад аб падрыхтоўцы да першай усебеларускай выстаўкі с.-г. і прамысловасьці.

ПУШНЫ КАМБІНАТ У МЕНСКУ

Пушнасындыкат і Наркамгандаль БССР заключылі ўмовы аб пабудове ў Менску пушнога камбінату. У склад камбінату ўвойдуць: шапачная фабрыка з прапускной здольнасьцю ў 500 тысячі шапак у год, футравы цэх у 40 тысяч палітО і 250 тысяч адзінак жаночых футравых камплектаў. Пры камбінаце будзе таксама абсталявана футравая і красільная фабрыка, якая разьлічана на два мільёны адзінак у год. Пабудова камбінату павінна быць скончана да студзеня 1931 году. Кошт пушнога камбінату—паўтара мільёны руб.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПРАЛЕТАРСКАГА СТУДЭНЦТВА

Учора ў Менску адкрылася Усебеларуская канфэрэнцыя пралетарскага студэнцтва. Зьехалася 80 дэлегатаў. Канфэрэнцыя абгаворыць рад пытаньняў, зьвязаных з работай вышэйшай школы ў падыходзячым навучальным годзе і студэнцкіх прафэсыянальных арганізацыях.

НАЗНАЧЭНЬНЕ

Старшынёю новага беларускага акцыянага таварыства «Белсадгародніна» назначаны **тав. ГЕЙНЭ.**

Каналізацыйная сетка пашыраецца

Паводле пяцёхгодовых арыентовачных вестак, кошт пабудовы каналізацыі ў Менску складае прыблізна каля 3 млн. руб., з якіх каля 200.000 руб. былі выдаткаваны на пабудову помпавае станцыі.

Тэрмін скончэньня пабудовы каналізацыі спазьніўся на паўгода. На сёньняшні дзень сетка каналізацыі ўжо пракладзена па ўсіх цэнтральных вуліцах: ёю ахоплены Маскоўская, Нова-Маскоўская, Савецкая, Ленінская, Інтэрнацыянальная, Нямігская, Унівэрсытэцкая і інш. вуліцы і Пуліхоўская і Беларуская слабады.

Агульная даўжыня пракладзеных трубаправодаў вулічнай сеткі раўняецца 25 клм., даўжыня калектараў 8 кілём. і напорных водаправодаў 3 кілём.

Распачаты работы па заканчэньні пракладкі трубаправодаў па Маскоўскай і Савецкай вуліцах. Вядуцца работы па далучэньні да каналізацыі першай Савецкай гасьцініцы, пошты, Камунбанку, сталоўкі МЦРК № 1, клюбу харчавікоў і дому грудного дзіцяці. У хуткім часе пачнуцца работы па далучэньні камбузу, другой савецкай сямігодкі і гасьцініцы былое «Эўропа» і па пракладцы калектару ад Беларускай слабады да Ляхаўкі.

Каналізацыйны аддзел зараз злучаны з водаправодным аддзелам Эльводу.

Агульнае тэхнічнае кіраўніцтва каналізацыяй ускладзена на інжынэра Каводкіна.

А. МІРОНАЎ.

Пуск каналізацыі

ТАВ. АКСЮЧЫЦ УКЛЮЧАЕ ТОК

Арганізаваць калектыўнае атрыманьне выйгрышаў

Праз тры дні ашчадныя касы будуць аплачваць выйгрышы па 3-й пазыцыі індустрыялізацыі. Улічваючы гэта, камісіі садзейнічаньня на прадпрыемствах наладзілі калектыўнае атрыманьне выйгрышаў праз члена камісіі садзейнічаньня. У сувязі з гэтым, трэба, каб камісіі садзейнічаньня выявілі ў сваіх калектывах усіх асоб, у каго ёсьць выйгрышы, а таксама забіралі замацавальныя талёны, атрымліваючы ад адміністрацыі пасьведчаньне на атрыманьне гэтых аблігацый. Паводле гэтых пасьведчаньняў ашчадкасы будуць выдаваць аблігацыі ў адначасова аплачваць выйгрышы.

Гэта вельмі важнае мерапрыемства. Напрыклад, калі ў калектыве атрымаюць выйгрышы 20 чалавек, дык усім ім ня трэба будзе хадзіць па атрыманьне гэтых выйгрышаў. Камісіі садзейнічаньня самі раздадуць выйгрышы непасрэдна на прадпрыемствах.

Пры калектыўных заяўках на выйгрышы трэба падаць сьпіс выйгрышаў з дадаткам замацавальных талёнаў і пасьведчаньні ад адміністрацыі на выдачу гэтых аблігацый.

Ашчадная каса пры калектыўных заяўках будзе аплачваць выйгрышы бяз усякае чаргі.

Вось чаму камісіі садзейнічаньні павінны арганізаваць калектыўнае атрыманьне выйгрышаў.

ФАЙНБЭРГ.

Вялікі пажар у вёсцы Скабіне

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). 8-га мая ў вёсцы Скабіне, Капыльскага раёну, ад неасьцярожнага абыходжаньня з агнём выбухнуў вялікі пажар. Усяго згарэла 25 будынкаў. Страты ад пажару дасягаюць каля 28.000 руб., чалавечых ахвяр няма. Ня гледзячы на тое, што вёска Скабін знаходзіцца за дзьве вярсты ад м. Капыля, Капыльская пажарная дружына несвоечасова прыняла ўдзел у тушэньні пажару.

Дзіўная дыялектыка Менскага Акругова-га Інспэктарыяту Аховы Здароўя

Міліцыя пунктуальна выконвае загады санітарнай часьці аховы здароўя гарсавету аб чыстцы вуліц, а па дварох ні рэтарадныя месцы, ні памыйныя ямы не дэзынфэктуюцца.

Гарсавет трымае шмат санітарных і усякіх іншых дактароў. Утрымлівае інфэкцыйныя больніцы. Аддзел аховы здароўя агітуе аб прафілактыцы і ў тойжа самы час у працягу чатырох год ігнаруе высунутае пытаньне аб ліквідацыі звалкі на Татарскім балоце, куды звозіцца бруд з усяго гораду Менску (аб гэтым пісалася ў газ. «Зьвязда»). Хіба-ж гэта ня дзіўная дыялектыка Менскага інспэктарыяту аховы здароўя?

Татарскае балота, куды з усяго гораду звозіцца бруд з памыйных ям і рэтарадных месц, знаходзіцца за тысячу крокаў ад Пляцу Волі. Наўкола звалкі, з усіх бакоў—горад. Бруд звальваюць літаральна сярод гораду. Звалка бруду ня толькі пад нагамі, на дарозе, але яна пад носам у вайсковай школы. Дзе-ж гэта відана? Між тым, каму, як не санітарным дактаром, ахоўцам народнага здароўя, павінна быць вядома, што, дапускаючы звальваньне бруду чуць ня ў самым цэнтры гораду, ахова здароўя парушае самыя элемэнтарныя правілы прафілактыкі і дарма траціць сродкі на гэту мэту.

Каму, як не санітарным дактаром, павінна быць вядома, што на многа гадоў можа быць заражана глеба і падгрэбавая вада ў раёне гэтае звалкі, дзе чуць не па кожным дварэ ёсьць студня. Апрача гэтага, усім вядома, што на неабяшкоджаным брудзе, на гэтым звалцы-агародзе растуць радыса, салата, буракі і іншая гародніна, якая ідзе для патрэб гораду.

Татарам-агароднікам гэтыя нячыстоты патрэбны як моцнае ўгнаеньне і яны самі звозяць яго ў гароды і просяць другіх. Яны кажуць, што дактары з гарсавету дазволілі звальваць нячыстоты ў гарод. І... паваялі горы.

Ня гледзячы на тое, што некаторыя жыхары пісалі ў аддзел аховы здароўя заявы з просьбаю паслаць санітарную камісію для абсьледваньня, ніхто на гэта ўвагі не зварачае. Гной, памыі ляжаць на дарозе і да гэтага часу.

Мы спадзяемся, што па гэты раз гарсавет прыме патрэбныя меры.

А. О.

Паянакапленьне ў спажывецкай каапэрацыі

На апошнім пасяджэньні Эканомпарады пры СНК БССР было разглядзена пытаньне аб паянакапленьні ў спажывецкай каапэрацыі. Эканомпарада адначыла нездавальняючае выкананьне збору паёў і ўкладаў па сыстэме спажывецкай каапэрацыі за першае паўгодзьдзе 1929-30 г., асабліва па сэктары работай каапэрацыі. Паўгадовы плян паянакапленьня па сельскім сэктары ня выканан на 70 проц., па рабоча-гарадзкім сэктары — на 43 проц.

У справу паянакапленьня была слаба ўцягнута грамадзкасьць. Спажывецкая каапэрацыя ня прымала ніякіх мер у адносінах да паасобных арганізацый, якія ня выконвалі пляну паянакапленьня.

Эканомпарада даручыла Белкаапсаюзу ў 10-дзённы тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы аб поўным выкананьні за другое паўгодзьдзе 1929-30 г. кантрольных лічбаў па мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Для больш пасьпяховага выкананьня пляну на зборы паёў прапанавана Белкаапсаюзу практыкаваць сыстэму эканамічнага заахвочаньня тых арганізацый, якія добра выконваюць плян паянакапленьня.

Вывучэньне вопыту работы рэарганізаванага апарату Віцебшчыны

Сакратарыят ЦВК пастанавіў заслухаць пасьля XIII зьезду КП(б)Б на пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК БССР даклад Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР аб выніках рэарганізацыі Віцебскае вопытна-паказальнае акругі з пункту погляду выяўленьня магчымасьці і мэтазгоднасьці пашырэньня гэтага вопыту на іншыя акругі БССР.

Да заслухоўваньня гэтага дакладу будуць сабраны заключэньні ад усіх наркаматаў і іншых цэнтральных устаноў БССР па паказаным пытаньні, а таксама праведзена абсьледваньне акругі інструктарскім апаратам ЦВК.

Вымова за павышэньне ставак

За сыстэматычнае павышэньне ставак, вызначаных Наркампрацы, РСІ абвясьціла вымову дырэктару Белсельтрэсту т. Грэбенчыку.

Каналізацыя ў Менску



НА ЗДЫМКУ: МАШЫННАЯ ЗАЛЯ

Правілы прыёму

на 2-х гадовыя курсы арганізатараў нарасьветы і двухгадовыя курсы працаўнікоў друку пры камвузе БССР імя У. І. Леніна на 1930-31 нав. год

I.

1. Курсы арганізатараў народнае асьветы зьяўляюцца установай камвузу і маюць на мэце рыхтаваць партыйныя кадры для кіраўнічай работы па народнай асьвеце ў раёнах (райінспэктары, БССР.

2. На курсы прымаюцца т. т., якія здавальняюць наступным умовам: а) стаж у прамысловасьці або ў сельскай гаспадарцы ня менш 3-х год, б) ня менш двух год партстажу (два поўныя гады да 1-га верасьня 1930 г., без замены стажам ЛКСМБ), в) ўзрост да 34 год.

Увага: Пры ўсіх гэтых умовах перавага даецца чырвонаармейцам, удзельнікам грамадзянскае вайны і т. т., якія маюць стаж актыўна-партыйнай і грамадзкай работы.

г) мець агульна-адукацыйныя веды ў аб'ёме ня ніжэй сямігодкі, або вячэрняй школы павышанага тыпу, добра арыентавацца ў палітычных падзеях бягучага дня; ведаць асноўныя моманты гісторыі партыі і палітэканоміі (у аб'ёме скарочанага падручніка Яраслаўскага і Леонцьева).

II.

1) **Курсы работнікаў друку** зьяўляюцца установай камвузу, якая ставіць сваёй задачай падрыхтоўку кваліфікаваных работнікаў друку для рэдакцый цэнтральных, акруговых, калгасных і фабрычна-заводзкіх газэт БССР.

2) Тэрмін навучаньня на курсах—два гады.

3) На курсы прымаюцца супрацоўнікі рэдакцый газэт, члены рэдкалегій, фабрычна-заводзкіх насьценных газэт, а таксама рабкоры, селькоры і ваенкоры, якія зьяўляюцца членамі КП(б)Б і якія адпавядаюць наступным запатрабаваньням: а) вытворчы стаж у прамысловасьці, ці сельскай гаспадарцы ня менш 3-х год, б) партыйны стаж ня ніжэй 2-х год (без замены стажу ЛКСМБ), в) вопыт партыйна-масавай работы, г) узрост ад 22 да 34 год.

Увага: Пры ўсіх гэтых умовах перавага даецца чырвонаармейцам, удзельнікам грамадзянскае вайны і т. т., якія маюць стаж актыўна-партыйнай і грамадзкай працы.

4) Паступаючыя на курсы павінны быць добра пісьменнымі, уметь выкладаць свае думкі для друку ў пісьмовай форме, арыентавацца ў бягучых палітычных пытаньнях і ўладаць асноўнымі відамі на гісторыі УсеКП(б) і палітэканоміі.

Увага: Пажадана апрача гэтага падаць свае работы, зьмешчаныя ў друку за апошні год.

Ва ўсім іншым, як і пры паступленьні (прадастаўленьне дакумантаў і г. д.) гэтак-жа і ў камвузе (матар'яльнае забесьпячэньне і г. д.) студэнты курсаў прыраўноўваюцца да студэнтаў асноўнага камвузу.

Гл. правілы прыёму ў камвуз Беларусі на 1930-31 нав. г. «Зьвязда» № 3, ад 4/I—30 г.).

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ БЕЛКААПСАЮЗУ

Камісія ЦКК НК-РСІ па чыстцы Белкаапсаюзу паведамляе, што 17 і 18-га мая з 18 з палов. гадз. У КЛЮБЕ ЧЫГУНАЧНІКАЎ імя Леніна будуць праходзіць індывідуальную чыстку супрацоўнікі апарату Белрабсаюзу. Запрашаюцца рабочыя і служачыя.

СЁНЬНЯ

Менакрсавет СВБ (вул. Энгельса, 30). Пасядж. прэзыдыуму ў 19 гадз. Яўка чл. прэз. і Акрсавету абавязкова.

Выпуск вяч. саўпартшколы 17-га мая пераносіцца на 23 мая.

Дом Асьветы. Сход дашкольнай цэхячэйкі ЛКСМ у 19 гадз.

— Агульны сход тэх. працаўн. чл. саюзу Працасьветы. Дакл. акрінспэкт. нарасьветы. Пач. у 19 гадз.

— У 19 гадз. сход камс. шк. яч. Яўка камс. абавязкова.

Пэдгабінэт. У 20 гадз. сэкцыя палітэхнічнага выхаваньня. Агра-грамата ў палітэхнічнай школе. Дакл. тав. Лазарэнка.

Антырэлігійны унівэрсытэт. (Пэдфак фіз. аўд.). Заняткі ў 18 гадз. 15 м.

Пасядж. жансэкцыі Фрунз. РК МОПР'у. Яўка ўсіх чл. жансэкцыі абавязкова. Запрашаюцца. ЖАКТ. актыў.

БДУ (4 аўд. прыродазнаўч. корп.) сэмінар. асьпір. гістор. Дакл. т. Лібман «Прагнозы Маркса і Энгельса аб рэвалюцыі 1848 г. у Нямеччыне». Запрашаюцца ВАР, камвузу і выклад. гісторыі.

ЖАКТ № 6 (Нямігa, 14). Пачынае пасядж. фракцыі праўленьня разам з партыйцамі, што пражываюць у дамах ЖАКТ'у. Пач. у 18 з палов. гадз.

ЦСПСБ (Дом працы, другі паверх). Нарада сэктару вытворчасьці і зарплаты па пытаньні падвядзеньня вынікаў самаправеркі дзяржнармаваньня. Яўка брыгадзіраў, што рабілі самаправерку, абавязкова. Запрашаюцца прадст. мясцкомаў тых устаноў, дзе адбывалася самаправерка, а таксама прадст. зацікаўленых ЦП саюзаў і гаспадарчых органаў. Пач. у 19 гадз.

18 мая ў 11 гадз. (памяшк. НКА)—нарада загадчыкаў курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ, рабфані і тэхнікумы г. Менску.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Фрунзаўскі райком КП(б)Б
СКЛІКАЕ
сёньня, а 7 гадз. увеч. НАРАДУ ўпоўнаважаных па „Зьвязьдзе"
Упоўнаважаныя ад іншых сходаў і нарад у дзень гэтае нарады
ВЫЗВАЛЯЮЦЦА
Нарада адбудзецца ў памяшканьні райкому.
Райком КП(б)Б.

Сад „ПРАФІНТЭРН" 17 і 18 мая
ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКАГА БАЛЕТУ „ИСКУССТВО ТАНЦА" імя Веры МАЙЯ.
Білеты ў касе тэатру і ў рабкасе. На 16 і 17 мая УСЕ БІЛЕТЫ ПРОДАНЫ.
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР 19 мая
Пачатак а 9 г. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
ЗАВАЯВАНАЯ ЗЯМЛЯ
Вытворчасьць Белдзяржкіно
Мастацкі фільм ў 5 частках.
Кіно-штомесячнік Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая" № 5-
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ гаст ролі народнай кітайскай трупы
ЛЮ-КУМ-ХАЙ нябачнае відовішча.
Палёт на носах. 100 пірыз таў у паветрі і т. д.
Пачатак а 7 г. увеч.—КАСА—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал
Замежны мастацкі фільм
АПОШНІЯ НАВІНЫ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
КАЛМЫКІ
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. | Каса ад 5 г.

КІНО Пралетары
Новы мастацкі фільм Вытворчасьці АРМЕНКІНО
ПАД ЧОРНЫМ КРЫЛОМ
у 6 частках
Пачатак 1 сэансу а 7 г.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
КУЛЬТУРФІЛЬМ
НУРЫ
у 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена—ад 12 г. дня.

КІНО Спартак
ПАТ І ПАТАШОН
у фільме ПАЛІЦЭЙСКІЯ кам. у 6 частк.
Пачатак сэансаў: 7 г. 15 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

„ТУРКСІБ"
Рэжысэр Віктар Турын
Асыстэнт Е. Арон
Апэратары: Е. Славінскі і Б. Францісон
ПРЭСА АБ „ТУРКСІБЕ"
„ТУРКСІБ" бязумоўны ўклад у савецкую кінэматаграфію „Известия ВЦИК" 21-IX
„ТУРКСІБ" гэта буйная перамога мастацтва... „Вечерняя Москва" 31-VIII-29 г.
„ТУРКСІБ" бязумоўна першы сьмелы і ўпэўнены крок наперад „Нов. Зрит." № 38
...Дайце нам побольш прыгожых фільмаў, як „Турксіб" „Наша Газ." 7-VII-29 г. справаздача кіно-канфэрэнцыі
„ТУРКСІБ" сапраўды найлепшы фільм. „Труд" 4-IX-29 г.
„ТУРКСІБ" бязумоўна зьяўляецца вялікім посьпехам нашай нізматаграфіі „Моск. Комсомол." 3-IX-29 г.
„ТУРКСІБ" захоплівае, пераконвае натхняе „Огонек" № 31 11-VIII-29 г.

Госстрою ССР Армении ТРЕБУЮТСЯ:
1. Инженер-строитель на должность Зав. п/отделом технич. нормирования.
2. Инженер-рационатор.
3. Техник-нормировщик.
Обращения, с приложением подробной биографии, направлять в г. Эривань, Армгосстрою.

БЕЛКАМУНБАНКУ (МЕНСК)
патрабуюцца ЭКАНАМІСТЫ з фінансавым стажам, ТЭХНІК-БУДАЎНІК.

ТРЕБУЮТСЯ
НЕМЕЦКИЕ, ПОЛЬСКИЕ И ЕВРЕЙСКИЕ НАБОРЩИКИ
на постоянную работу
в типографию «Коммунист», Харьков, Пушкинск. ул., № 31.
Квартиры не предоставляются и подъемные не оплачиваются.
Железнодорожный билет оплачивается типографией.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА — ЎЗЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурапа-вэнэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

ПРЫЁМ у Беларускі Дзяржаўны Вэтінстытут пачаўся 10 мая г. г. і працягнецца да 20 чэрвеня ўключна.
Асобы, якія падлягаюць іспытам павінны зьявіцца 25 чэрвеня ў г. Віцебск, будынак Вэтінстытуту
Правілы прыёму былі апублікаваны ў газ. «Савецкая Беларусь» і «Віцебскі Пралетарый».

50 кошт публікацыі аб згубе дакумента

УМОВЫ ПРЫЁМУ НА КУРСЫ РАДЫЁ-ТЭХНІКАЎ.

1. ОДР, Белкаапсаюз і Радыёцэнтр арганізоўваюць у гор. Менску 3-месячныя курсы па падрыхтоўцы радыё-манцёраў і загадчыкаў радыёвузлоў.

2. Курсы разьлічаны на 90 чал.

3. На курсы прымаюцца асобы абодвух радоў ва ўзросьце ад 18 да 30 год. Ад паступаючых патрабуецца дастатковае налітычнае разьвіцьцё і агульная асьвета, прыкладна у аб'ёме 7-годкі, але-ж ня ніжэй курсаў 5-гадовых прапоўных школ і ёй роўных па праграме.

УВАГА: У першую чаргу будуць залічаны члены і кандыдаты КП(б)Б, ЛКСМБ, рабочыя, батракі, калгасьнікі і прыхільнікі радыё, якія маюць камандыроўкі ад адпаведных арганізацый.

4. Да заявы аб залічэньні на курсы неабходна прыкласьці: а) камандыроўку, або рэкамэндацыю партыйных, савецкіх, прафэсыянальных, каапэрацыйных арганізацый і ОДР, б) заверапую анкету, в) пасьведчаньне аб сацыяльным і маёмасным становішчы, як паступаючага, таксама і яго бацькоў, г) аб асьвеце, д) аб здароўі, е) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын).

5. На ўвесь час навучаньня кожны курсант забясьпечваецца стыпэндыяй у разьмеры 40 руб. на месяц, патрэбнай літаратурай, дапаможнікамі і інтэрнатам.

6. Заявы прымае ОДР (Менск, Ленінская, 16) і Белкаапсаюз (Савецкая, 43-13) да 25 мая г. г.

7. Залічэньне на курсы праводзіцца спэцыяльнай камісіяй.

8. Аб выніках прыёму кожны падаўшы заяву будзе паведамлены асабіста па паказаным ім паштовым адрасе.

9. З агульнага ліку курсантаў 40 асоб бранруюцца Белкаапсаюзам, якія паступаюць па камандыроўках Райсаюзаў і аддзяленьняў БКС.

10. Аб дні запяткаў будзе паведамлена асобна.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК
у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ,
атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА"
па месцы знаходжаньня ў водпуску,
паведаміўшы ў аддзел падпіскі газ. «ЗЬВЯЗДА»
ВАШ НОВЫ АДРАС.
Газэта будзе дасылацца па новым адрасе
без асобнай даплаты.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы пічыць несапраўднымі:

Асабов. пасьвед